КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №29 (157)
◂ 21 ЖНІЎНЯ ◂ 2009 г.

# Новы Час



Юрый Лявонаў: СУДОВАЯ СІСТЭМА...

Стар. 4

**АДНА ТЭМА — РОЗНЫЯ ПОГЛЯДЫ**

На артыкул Івана Біча адгукнуўся Павел Марчук, першы сакратар польскай амбасады ў Беларусі

Стар. 6

**ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ПА-ПОСТМАДЭРНІСЦКУ**

Прэм’ера мінулага тыдня — стужка «Ганебныя выродкі» славутага амерыканскага рэжысёра Квенціна Таранціна

Стар. 12

**ГРАМАДСКІ ЦУД У ЛЮБЧЫ**

Стар. 14

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ!**

Нататкі Сяргея Салаўёва

**з рок-фэсту «Be Free»**

Чарнігаў, 22–23 жніўня

ТРАГІЧНАЯ ГАДАВІНА

# БЕЗ ВЕСТАК ЗНІКЛЫЯ

Вольга ХВОІН

**Родныя Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзмітрыя Завадскага, якія зніклі без вестак дзесяць гадоў таму, лічаць, што ўлады могуць імітаваць расследаванне гэтых гучных спраў, каб набраць палітычныя бонусы напярэдадні наступнай прэзідэнцкай выбарчай кампаніі.**



Photo.ByMedia.Net

Дзесяць гадоў таму ў Беларусі зніклі без весткі двое апазіцыйных палітыкаў — былы міністр унутраных спраў генерал Юрый Захаранка і былы кіраўнік Цэнтрвыбаркама Віктар Ганчар, бізнесмен Анатоль Красоўскі. Праз год знік аператар расійскага тэлеканала ОРТ, былы асабісты аператар Аляксандра Лукашэнкі Дзмітрый Завадскі.

Следства па справе знікнення Юрыя Захаранкі, Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага праводзілася не толькі па факце знікнення, але і забойства. Кропка ў гэтых расследаваннях дагэтуль не пастаўлена. Следства па справе Дзмітрыя Завадскага было спынена ў сакавіку 2006 года. У 2002 годзе Мінскі абласны суд прызнаў вінаватымі ў выкраданні Дзмітрыя Завадскага афіцэраў спецпадраздзялення МУС «Алмаз» Валерыя Ігнатовіча і Максіма Маліка (асуджаныя на пажыццёвае зняволенне), былога курсанта Акадэміі МУС Аляксея Гуза (асуджаны на 25 гадоў пазбаўлення волі), а таксама грамадзяніна Сяргея Савушкіна (ужо выйшаў на волю). Ніхто з асуджаных не прызнаў сваёй віны. У 2003 годзе суд Фрунзенскага раёна сталіцы прызнаў зніклага журналіста памерлым, але цела Дзмітрыя Завадскага дагэтуль не знойдзена.

Адмысловы дакладчык юрыдычнай камісіі Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы Хрыстас Пургурыдэс у 2004 годзе па выніках візіту ў Беларусь падрыхтаваў справаздачу «Зніклыя асобы ў Беларусі», у якой гаварылася, што сляды вінаватых у знікненні названых людзей вядуць у бліжэйшае атачэнне беларускіх уладаў, у прыватнасці сярод падазраваных фігуруюць былы камандзір вайсковай часткі 3214 Дзмітрый Паўлічэнка, экс-міністры МУС Уладзімір Навумаў і Юрый Сівакоў, былы генпракурор Віктар Шэйман.

З высновамі Пургурыдэса пагаджаецца і юрыст праваабарончага грамадскага аб’яднання «Беларускі Хельсінскі камітэт» Гары Паганяйла, які адсочвае развіццё спраў на працягу дзесяці гадоў. «Гэтыя злачынствы ўжо раскрытыя на юрыдычным узроўні. Былі высветлены асобы, якія падазраюцца ў выкананні гэтых злачынстваў. Знікненне экс-міністра МУС Юрыя Захаранкі, які валодаў канфідэнцыяльнай інфармацыяй, павінна было б прымусіць улады хутчэй расследаваць гэту справу. Аднак крымінальная справа па факце знікнення Юрыя Захаранкі была заведзена толькі пасля знікненняў Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага. Дзяржава праявіла нежаданне раскрываць гэтыя справы. Гэта ўскосна пацвярджае версію, што да знікнення маюць дачыненне вышэйшыя службовыя асобы Беларусі», — адзначае юрыст.

Тэрміны расследавання спраў Ганчара, Красоўскага, Захаранкі ў чарговы раз падоўжаныя на два месяцы — да пачатку кастрычніка. Сваякі зніклых мяркуюць, што расследаванню могуць надаць наўмысна няправільны накірунак. Зінаіда Ганчар — жонка зніклага без вестак палітыка Віктара Ганчара расказала, што ў некаторых РАУСах з’явіліся фотаздымкі Віктара Ганчара і Анатоля Красоўскага, быццам бы вядуцца апытанні людзей аб тым, ці бачылі яны чырвоны аўтамабіль «БМВ», сляды якога былі знойдзены на месцы здарэння. Разам з тым жанчына адзначае, што следчы Вараўка, які зараз вядзе справу, адмаўляецца кантактаваць з роднымі зніклых.

Зінаіда Ганчар, Вольга Завадская і Ульяна Захаранка звярнуліся ў ПАСЕ з просьбай правесці парламенцкія слуханні па справе зніклых у Беларусі. Лісты з просьбай пачаць міжнароднае следства былі накіраваныя да прэм’ер-міністра Швецыі, краіны, што старшынствуе цяпер у ЕС, таксама да кіраўнікоў Расіі, ЗША і Германіі.

Адмысловы зварот быў накіраваны да генеральнага пракурора Беларусі Рыгора Васілевіча. У ім сваякі просяць прадставіць справаздачу пра вынікі расследавання да 16 верасня. «Калі беларускія праваахоўныя органы не здольныя расследаваць гэтыя злачынствы, мы гатовы дапамагчы ў прыцягненні да расследавання спецыялістаў з іншых краін. Мы хочам, каб былі пакараны вінаватыя ў гэтых злачынствах», — гаворыцца ў лісце.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРАСЛАЎ. СУСТРЭЧА МОЛАДЗІ

19–22 жніўня ў Браславе прайшла IV Дыяцэзіяльная сустрэча моладзі. «Дзякую Богу радасцю вялікай» — так гучыць тэма сёлетняй сустрэчы, якая адбылася напярэдадні ўрачыстай каранацыі абраза Маці Божай Валадаркі Азёраў. У праграме мерапрыемства — супольная малітва, святая імша, сустрэчы ў групах. А таксама адпачынак: футбол, канцэрт удзельнікаў, сустрэчы каля вогнішча. У мерапрыемстве прымала ўдзел моладзь старэйшая за 16 гадоў. Падчас чування ў ноч з 21 на 22 жніўня ўдзельнікі мелі час на супольную адарацыю, на якой змаглі памаліцца ў інтэнцы таго, каб урачыстасць у Браславе прынесла багаты духоўны плён.

### ПАСТАВЫ. ЛЕПШЫ ПРЫВАТНЫ ЦЭНТР

Усяго толькі 5 год дзейнічае Пастаўскі прыватны цэнтр турыстычных паслуг, але ён дамогся прызнання на нацыянальным і нават міжнародным узроўнях. За гэты час у райцэнтры і ваколіцах пабывалі за 20 тысяч турыстаў розных арганізаваных груп. Да ранейшых сваіх узнагарод пераможцаў і лаўрэатаў рэспубліканскіх турыстычных конкурсаў «Спазнай Беларусь» турфірма з Пастаў сёлета першая на Віцебшчыне дабавіла званне пераможцы абласнога конкурсу ў намінацыі «Лепшы прадпрымальнік у сферы турызму». Яго супрацоўнікі пастаянна ў творчым пошуку. Знакаміты маршрут «На госці да Зюзі Паазерскага» стаў не толькі зімовым. Вясной паспяхова запрацаваў новы маршрут — «Велікодныя традыцыі Пастаўшчыны». Да 600-годдзя Пастаў турцэнтр распрацаваў некалькі экскурсійных маршрутаў для школьнікаў і моладзі з мэтай далучыцца да гісторыі і сённяшняга дня роднага краю. Ёсць цікавыя напрацоўкі па сумеснаму супрацоўніцтву з калегамі з Літвы. Летам, як і раней, жыхарам раёна прапануюцца танныя пуцёўкі на адпачынак у Крыму, а таксама на курортах Турцыі, Балгарыі і Туніса.

### АСТРАВЕЦ. ДЫСКУСІЯ ПА АЭС

Актывісты супраціву пабудовы АЭС на Беларусі выступілі з новай ініцыятывай. Яна закранае шырокае кола грамадскасці, прыцягвае ўвагу ўсіх СМІ, НДА, ініцыятываў і зацікаўленых грамадзян, хто хацеў бы прыняць удзел у абмеркаванні дакумента пад назвай АУНА (Адзнака ўздзеяння на навакольнае асяроддзе), які датычыцца пабудовы АЭС у рэспубліцы. Гэта важны этап у працэсе прыняцця рашэння, паколькі не проста прымушае заказчыка гэтага праекта арганізаваць абмеркаванне АУНА з зацікаўленай грамадскасцю і максімальна ўлічыць усе пажаданні, заўвагі і прапановы. АУНА будзе апублікавана і размешчана ў інтэрнэце. Зацікаўленая грамадскасць можа адправіць свае пажаданні, прапановы, каментары (напрыклад, не будаваць станцыю ў Астравецкім раёне — і аргументавана патлумачыць, чаму, ці, напрыклад, не будаваць станцыю ў Беларусі наогул) і заказчык абавязаны ўлічыць гэтыя каментары.

Сам дакумент АУНА праз 30 дзён пасля публікацыі будзе абмяркоўвацца на грамадскіх слуханнях у Астраўцы. Больш нідзе слуханні праводзіцца не будуць. Гэта будзе адкрытае мерапрыемства, дзе змогуць выказацца ўсе. Зараз усе могуць далучыцца сябе і свае арганізацыі ў спіс тых, хто хацеў бы атрымліваць інфармацыю аб працэдуры абмеркавання АУНА, а таксама надрукаваць рэгламент слуханняў і дату. Гэта можна зрабіць, напісаўшы ліст, пажадана ад арганізацыі ці СМІ, у Дырэкцыю будаўніцтва АЭС па электроннай адрасе *dsae@tut.by*.

### ГРОДНА. У ГОНАР БЕЛАРУСАЎ

Саюз палякаў на Беларусі (кіраўнік Анжэліка Борыс), які пазбаўлены рэгістрацыі дзяржаўнымі органамі, 15 жніўня правёў шэраг імпрэзаў, прысвечаных угодкам бітве на Вісле пад Варшавай у 1920 годзе, якая ў гэты дзень адбылася між бальшавікамі і Войскам Польскім і мела пераломны момант у савецка-польскай вайне таго часу. Гэты дзень паўстаў як дзень Войска Польскага. Найперш святочная імша прайшла ў касцёле бернардынцаў, на якой прысутнічала некалькі сотняў чалавек. Надалей адбылося ўшанаванне памяці загінуўшых, што пахаваныя на Вайсковых могілках. У большасці сваёй гэта жаўнеры Першай беларуска-літоўскай дывізіі, што ваявалі ў складзе Войска Польскага. Напрыканцы ў памяшканні Саюза палякаў адбыўся святочны канцэрт.

**Падрыхтаваў Язэп Палубятка**

АХВЯРЫ

## ЖАЛОБНАЯ ВЫПРАВА Ў «КАТЫНЬ»

**Шэраг грамадскіх арганізацый, сярод якіх Рух «За Свабоду», Беларускае добраахвотнае таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры, Саюз палякаў Беларусі, Беларускае Шуманаўскае таварыства, аргкамітэт па стварэнні Руху «Разам», плануюць адзначыць 23 жніўня — Еўрапейскі дзень ахвяраў таталітарных рэжымаў — жалобнай выправай у Катынь.**

Мемарыяльны комплекс «Катынь» — месца апошняга спачыну каля 15 тысяч ахвяраў савецкага рэжыму розных нацыянальнасцяў — палякаў, беларусаў, рускіх, украінцаў і інш.

У праграме выправы:

- наведванне Польскіх вайсковых могілак з магіламі тысяч ваеннапалонных афіцэраў Войска Польскага, расстраляных у 1939 годзе па загадзе Сталіна;
- наведванне пахаванняў савецкіх грамадзян — ахвяраў рэпрэсій 1928–1938 гадоў, вязняў турмаў і канцлагераў Смаленска і ваколіцаў;
- ускладанне жалобных кошыкаў і вянкоў ад грамадскіх арганізацый Беларусі да памятных манументаў мемарыяльнага комплексу.

Выезд з Мінска: 23.08.2009 (нядзеля) а 8.00. Пачатак цырымоніі ў «Катыні»: каля 14.00.

Тэлефон для кантактаў у Беларусі: +375 29 652 00 86

Адрас мемарыяльнага комплексу «Катынь»: Расійская Федэрацыя, Смаленская вобл., Смаленскі р-н., пас. Гнездава, урочышча Коз'і Горы (18 км. на Захад ад Смаленска, злева ад шашы Смаленск — Віцебск).

Тэл.: +7 48 12 68 35 24.

Афіцыйны сайт: http://admin.smolensk.ru/history/katyn/index.htm

**Паводле прэс-службы Руху «За Свабоду» info@milinkevich.org**

СУД

## ДЗЯНІС ТУРЧАНЯК АШТРАФАВАНЫ

**Суд Ленінскага раёна Брэста 18 жніўня разгледзеў матэрыялы адміністрацыйнай справы ў дачыненні да каардынатара руху «За Свабоду» па Брэсце Дзяніса Турчаняка.**

Як паведаміў праваабаронца Раман Кісляк, суд прызнаў Турчаняка вінаватым на падставе арт. 23.4 Кодэкса аб адміністрацыйных правапарушэннях (непадпарадкаванне законнаму распараджэнню або патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёю службовых паўнамоцтваў) і аштрафаваў на 40 базавых велічынь.

Паводле слоў праваабаронцы, Турчаняка затрымалі 17 жніўня ў 18.20 непадалёк ад помніка, прысвечанага гісторыі Брэста, на скрыжаванні вуліц Савецкая і Гогаля, дзе ў 18.00 адбыўся флэшмоб мясцовых актывістаў дэмсіл. Дзяніс Турчаняк і актывіст міжнароднага грамадскага аб'яднання «Малады фронт» (Чэхія) Міхаіл Ільін назіралі за акцыяй. Да Ільіна падышлі два чалавекі ў цывільным і павялі яго ў адзін з двароў на вуліцы Гогаля. Сведка гэтага інцыдэнту Турчаняк пайшоў за імі, і яго таксама затрымалі. Затым абодвух актывістаў даставілі ў Ленінскі РАУС. Там у дачыненні да затрыманых былі складзены адміністрацыйныя пратаколы. У дачыненні да Турчаняка — за непадпарадкаванне законнаму распараджэнню або патрабаванню службовай асобы пры выкананні ёю службовых паўнамоцтваў, Ільіна — за дробнае хуліганства. У 21.40 Дзяніс Турчаняк быў адпушчаны з міліцыі. Міхаіл Ільін правёў ноч у ізалятары часовага ўтрымання.

«Разгляд адміністрацыйнай справы Міхаіла Ільіна адкладзены, бо ён заявіў хадайніцтва аб выдзяленні яму адваката. Дата правядзення судовага пасяджэння — 25 жніўня, пачатак у 10.00», — паведаміў Кісляк.

**Паводле БелаПАН**

## ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ. ПАДЗЕІ ТЫДНЯ

### ДЗІСНА. АРХЕАЛАГІЧНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ ЗАКОНЧАНА

У жніўні Дзісна прымала археалагічную экспедыцыю пад кіраўніцтвам навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Марата Клімава. Асноўная мэта экспедыцыі — знайсці матэрыяльныя доказы ранняга паселішча на тэрыторыі сучаснай Дзісны. Дзеля гэтага была праведзена шурфоўка некалькіх кропак горада. Безумоўным фактам стала тое, што Дзісна была заселеная ў XVI стагоддзі. А вось артэфакты XII–XIII стагоддзяў адшукваліся зрэдку. Фрагменты сярэднявечнай керамікі, якія траплялся ў шурфах, давядзецца дасканала даследаваць перад тым, як рабіць канкрэтныя высновы.

Увесь час на раскопках працавалі валанцёры з Мінска, Віцебска, Полацка, Глыбокага. Усяго да працы далучыліся каля 30 чалавек. Акрамя працы яны выдатна адпачылі. Гэтаму паспрыяла старшыня Дзісненскага гарсавета Вольга Мароз, якая гасцінна сустракала археолагаў, дапамагала вырашаць арганізацыйныя пытанні, аказала матэрыяльную падтрымку экспедыцыі. Удзельнікі раскопак падарожнічалі па Дзісне і Заходняй Дзвіне на баркасе і пароме, зрабілі велатур на аграсядзібу Мазурына, лёталі на дэльтапланах.

### ВАЛОЖЫН. МІЖНАРОДНЫ ВЕЛАМАРАФОН

У мінулыя выходныя на дарогах Валожыншчыны можна было сустрэць удзельнікаў міжнароднага веламарафона за мір «Парыж—Масква–2009». Веласіпедысты-аматары з краін Еўропы пераехалі мяжу раёна 9 жніўня ў 14 гадзін 30 хвілін. Больш за месяц удзельнікі велапрабегу «калясяць» па Еўропе. Валожыншчына адметна тым, што на яе тэрыторыю прыпадае палова запланаванага маршруту. Між іншым, гэты край запомніцца ўдзельнікам марафону не толькі адзнакай на спідометры, але і гасціннасцю, сардэчнасцю сустрэчы, уражаннямі ад наведвання гістарычных мясцін і помнікаў. Пра гэта клапаціліся вялікае кола людзей — аддзел фізкультуры, спорту і турызму райвыканкама, аддзел культуры, медыкі, райспажыўтаварыства і грамадскія актывісты.

### ТАЛАЧЫН. ШЧУКІН НАВЁЎ ПАРАДАК

У населеным пункце Коханава мясцовае ЖКГ актыўна праводзіць кампанію па высяленні неплацельшчыкаў за камунальныя паслугі. Болей за дзесяць чалавек пазбавілася жылля. Яшчэ 60 іскаў перададзена ў суд. Выселена была і жанчына з трохдзённым дзіцём. Каб аднавіць справядлівасць, актывісты грамадзянскай кампаніі «Наш Дом» звярнуліся да праваабаронцы Валерыя Шчукіна. Пасля яго ўмяшальніцтва Талачынскі суд адмяніў рашэнне аб высяленні.

### АСТРАВЕЦ. ПРАВААБАРОНЦЫ СУДЗЯЦЦА

У ліпені суд Астравецкага раёна (суддзя Дземешчык) палічыў крамольным факт перадачы Іванам Круком свайму сябру бюлетэняў «Мірны атам», «Астравецкі веснік», «Глоток воздуха» і газеты «Новы час» для азнаямлення з праблемаю пабудовы АЭС у рэгіёне і аштрафаваў былога начальніка тутэйшага РАУС на 700000 рублёў. Мясцовы праваабаронца палічыў, што гэта ёсць факт забароны інфармавання насельніцтва аб праблемах раёна, і звярнуўся са скаргай у абласны суд. Судовая калегія (суддзя Рачынскі) запланавала правесці пасяджэнне зачыненым. Аднак Івана Фёдаравіча падтрымаў праваабаронца Валеры Шчукін, і разгляд справы быў адкрытым, на яго былі дапушчаны журналісты і прадстаўнікі грамадскасці. 18 жніўня праваабаронца з Астраўца атрымаў копію рашэння абласнога суда, дзе напісана, што «з улікам усіх абставін па справе, грамадскай небяспекі здзейсненага, а таксама даддзеных аб асобе Крука І. Ф. падстаў для назначэння больш мяккага пакарання няма». Таму рашэнне суда першай інстанцыі было пакінута без змены. Неўзабаве наглядная скарга пойдзе на імя старшыні абласнога суда.

СВЯТА

## ДЗЕНЬ АГУРКА

**Іван БАРЫСАЎ**

**Ужо некалькі гадоў запар шклаўчане адзначаюць незвычайнае свята — свята агурка.**

Вось і ў гэтым годзе 8 жніўня такое мерапрыемства адбылося ў Шклове каля скульптурнай кампазіцыі «Агурок» і на плошчы каля раённага Дома культуры.

Вырошчваннем і продажам агуркоў шклаўчане займаюцца вельмі даўно, таму да гэтай гародніны ставяцца з вялікай павагай. Ураджэнцы іншых раёнаў Магілёўшчыны нават называюць шклаўчан «агурэчнікамі». Ну а пасля таго, як у горадзе ў 2007 годзе з'явіўся помнік агурку, Шклоў стаў безумоўнай сталіцай гэтай гародніны для ўсёй Беларусі.

На свяце былі арганізаваны выставы работ народных майстроў, выстава-продаж кветак, тэхнікі для апрацоўкі агародаў і шэраг іншых цікавых мерапрыемстваў. Плошча каля Дома культуры на пэўны часператварылася ў своеасаблівую гандлёвую слабаду, дзе размясціліся агурковыя павільёны. Там можна было не толькі набыць агурку ў любым выглядзе, а і паспытаць розныя стравы з агуркоў і іншай гародніны, атрымаць рэцэпты на любы густ.

## ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# НЕ КАСІЎ КОЛЯ КАНЮШЫНУ!

Сяргей САЛАЎЁЎ



**Здаецца, праўду кажуць мудрыя людзі: лепшы адпачынак — гэта змена працы. Калі ты цэлы дзень сядзіш перад кампутарам і стаміўся ад манітора і літараў на ім — паспрабуй пайсці паразгружаць вагоны з цукрам або бульбай. Калі ты кожны дзень вырашаеш дзяржаўныя пытанні, і над табой вісіць велізарны цяжар адказнасці, — паспрабуй пакасіць канюшыну. Адразу заўважыш: думаць у гэтай справе мала трэба. І наступае такая расслабуха, калі зменіш інтэлектуальную працу на фізічную! І мазгі расслабляюцца, і фізічную форму набіраеш.**

Менавіта такі ўрок на тыдні даў праграме «Формула ўлады» Аляксандр Лукашэнка. Падчас запісу праграмы беларускі прэзідэнт так і сказаў: «Самае прыгожае для аператараў, калі ўсе стануць разам і будуць ісці». І павёз здымачную групу да сябе ў Дразды, каб навучыць іх касіць. І сталі ў шэраг гулец хакейнай каманды прэзідэнта Міхаіл Захараў, старэйшы сын прэзідэнта Віктар, бізнесмен Юры Чыж, біятланіст Сяргей Булыгін, былы капітан зборнай па тэнісе Сяргей Цяцерын. І пачалі касіць.

Дарэчы, хто думае, што гэта справа лягчэйшая за кіраванне дзяржавай — моцна памыляецца. Як потым распавёў Міхаіл Захараў, у рэзідэнцыі прэзідэнта ў Драздах — пяць палёў. «Адно скончыў касіць — другое пайшло. Другое скончыў — ужо на першым вырасла. Трава ж расце без перапынку... Мы, бывае, і ў шэсць раніцы косім. У мяне свая каса, яна нават падпісаная. Усё вельмі сур'ёзна», — распавёў Міхаіл Захараў.

Каса ёсць нават у маленькага Колі, але, як паведаміў Захараў, касіць ён не вельмі імкнецца. «Маленькі яшчэ», — лічыць Захараў.

Аказалася, што заразны не толькі дрэнны, але і добры прыклад. Услед за прэзідэнтам працаўнікі Брэсцкага аблвыканкама ўзялі косы і выправіліся на бітву за ўраджай. 50 працаўнікоў Брэсцкага аблвыканкама высадзіліся ў СПК «Кутузаўскі» Кобрынскага раёна на аўсяным полі, на якім прымяненне камбайна з-за цяжкага стану змочаных каласоў было прызнана эканамічна немэтазгодным.

Паўсотні добраахвотнікаў з аблвыканкама да чатырох гадзінаў амаль без перапынку касілі авёс. Як паведамляе газета «Рэспубліка», адным з лідэраў стаў кіраўнік справамі аблвыканкама Антон Стэльмах, які і быў арганізатарам гэтага дэсанта. Супрацоўнікі аблвыканкама скасілі авёс на плошчы прыблізна ў пяць гектараў.

Але цікава тут адно. У прэзідэнта працоўны час, як і ў любога дзяржаўнага службоўца, — з 9 да 18 з перапынкам на абед. Ён свае палеткі косіць у вольны ад працы час. А хто замяняў на іх месцах 50 чыноўнікаў Брэсцкага аблвыканкама, якія правялі ў полі, адпачываючы ад надзённых спраў, амаль цэлы працоўны дзень? Можа, калі без іх можна абысціся на працягу дня, іх скараціць і накіраваць у касцы? Бо, як бачым, іх адсутнасці на працоўных месцах Брэсцкая вобласць нават не заўважыла. А пяць гектараў за дзень па палеглым збожжы — гэта сур'ёзны вынік і добры ўнёсак у харчовую бяспеку Беларусі.

На тыдні з'явілася і больш дрэнная навіна. Здаецца, беларусам давядзецца адмовіцца ад шкваркі пад чарку. У Беларусі 19 жніўня быў выяўлены першы факт заражэння высокапатагенным грыпам A/H1N1 — гэтак званым «свіным грыпам». Захварэлі грамадзянін КНР, які вярнуўся 10 жніўня з Кітая, і яго жонка.

Выяўленыя таксама 37 чалавек, з якімі кантактавалі захварэлыя. Па выніках медыцынскага агляду зроблена заключэнне, што ўсе яны здаровыя.

Цікава, што ў гэты ж дзень сёння на прэс-канферэнцыі галоўны санітарны лекар Беларусі Валянціна Качан заявіла, што выпадкаў захворвання на «свіны грып» у Беларусі няма.

На сёння ў свеце зафіксаваныя каля 220 тысяч выпадкаў захворвання на «свіны грып», памерлі 1882 чалавекі, у Еўропе — дзесяткі тысяч выпадкаў захворвання на «свіны грып». У Вялікабрытаніі захварэлі 12 тысяч 903 чалавекі, Германіі — 12 тысяч 493. У Расіі — 180 захварэлых, Польшчы — 150, Літве — 40.

Яшчэ адну сапраўдную свінню ўладам падклаў не хто-небудзь, а генеральны пракурор Беларусі Рыгор Васілевіч. У той час, як Парламенцкая асамблея Рады Еўропы паабяцала вярнуць Нацыянальнаму сходу Беларусі статус спецыяльна запрошанага толькі пасля таго, як будзе накладзены мараторый на смяротнае пакаранне, Васілевіч выступіў фактычна супраць гэтага мараторыя.

У гутарцы з журналістамі 19 жніўня ён заявіў: «Гэта мера адказнасці суровая, але справядлівая. Пакуль наш Крымінальны кодэкс не зменены ў гэтай частцы, і Канстытуцыя дапускае прымяненне смяротнай кары».

Нагадаем, 29 чэрвеня да вышэйшай меры пакарання Брэсцкі абласны суд прыгаварыў 30-гадовага жыхара Драгічынскага раёна за забойства сямі пажылых жанчын. 17 ліпеня Мінскі абласны суд прызначыў смяротную кару 25-гадоваму жыхару Салігорскага раёна, які быў прызнаны вінаватым у забойстве двух работнікаў СПК «Бальшавік-Агра», якія перавозілі грошы для выплаты зарплаты.

Такім чынам, нашы дэпутаты ў разгубленасці. Бо ў Палаце прадстаўнікоў стварылі нават адмысловую рабочую групу, якая будзе вывучаць магчымасці ўвядзення мараторыя на смяротнае пакаранне. Што рабіць зараз дэпутатам з гэтай групы? Можа, іх таксама — у поле касіць канюшыну?

Ну і, канешне ж, не кандыдат у касцы, але ж ахвяра сусветнага эканамічнага крызісу, які, бачна, усё ж закрануў Беларусь. Кіраўнік брытанскага PR-агенцтва «Bell Pottinger Group», знакаміты лорд Цімаці Бел, з якім беларускія ўлады заключылі кантракт на паляпшэнне іміджу краіны ў свеце, заявіў у інтэрв'ю брусельскаму інтэрнэт-выданню «EUobserver»: «Наш кантракт з Беларуссю скончыўся».

Кіраўнік брытанскага піяр-агенцтва «Bell Pottinger Group» адмовіўся даваць больш шырокую інфармацыю. Паводле выдання, надалей Лукашэнка збіраецца сам займацца сваім іміджам, без парадаў з боку заходніх экспертаў.

У адным з мінулых інтэрв'ю лорд Бел станоўча ацэньваў вынікі сваёй працы ў Беларусі: «Вельмі гасцінныя, вельмі прыемна было з імі працаваць». У свае заслугі Бел паставіў тое, што цягам года Лукашэнка даў інтэрв'ю такім уплывовым выданням, як «Finacial Times» і «Frankfurter Allgemeine Zeitung». Лорд таксама ўхваліў з'яўленне на афіцыйных фотаздымках Лукашэнкі разам з малодшым сынам Колем.

Вось толькі спадар Бел не сказаў пра свае недапрацоўкі. Колю касіць ён так і не навучыў.

## ФІГУРЫ ТЫДНЯ

### ПАВЕЛ СЕВЯРЫНЕЦ



Адзін з лідэраў Беларускай хрысціянскай дэмакратыі палітык Павел Севярынец вырашыў пакінуць у сябе цяжарную Алісу. Так завуць зайчыху, якую палітык злавіў падчас ціхага палявання на баравікі і лісічкі. «На зайца прыйшло паглядзець паўвёскі. Як высветлілася, з лесу я прынёс зайца-беляка (улетку яны, праўда, з бурай поўсцю). Дзіўныя паводзіны паблізу чалавека ў лесе таксама мелі тлумачэнне — гэта цяжарная зайчыха, якая мае хворыя вочкі, — перадае прэс-служба БХД распрвед Севярынца. Зайчыху палітык назваў у гонар гераіні вядомай кнігі Льюіса Кэрала — Аліса. «Зайчыха добра сілкуецца з вясковага гародчыка. Таму, спадзяюся, тут яна набярэ сілы да падлечыцца. Вось так у мяне з'явіўся свой чароўны трусік», — жартуе Павал Севярынец.

Да канца лета Павал Севярынец знаходзіцца ў творчым адпачынку ў вёсцы Унорыца Рэчыцкага раёну, там ён працуе над сваёй новай кнігай. Палітык і пісьменнік (яго аўтарству належаць некалькі кніг) даўно гаварыў, што піша «раман пра Беларусь» — аб'ёмны, эпічны твор.

### ЛЯВОН ТАРАСЕВІЧ



У Лапічах адкрылася выстава работ вядомага беларускага мастака родам з Падляшша Лявона Тарасевіча. Выстава — гэта частка праекту «Беларускія трылогі», які ладзіцца аб'яднаннем «Villa Sokrates» ужо на працягу 10 гадоў. Выстава прысвечана заснавальніку аб'яднання, беларускаму пісьменніку Сакрату Яновічу, паколькі гэта вельмі важная асоба ў ягоным жыцці. Экспазіцыя будзе працаваць да 13 верасня.

Лявон Тарасевіч — беларускі мастак у Польшчы. Скончыў Пластычны ліцэй у Супраслі, а ў 1984 годзе — аддзел жывапісу ў Акадэміі мастацтва ў Варшаве. Мастак падкрэслівае сваё беларускае паходжанне, прымае актыўны ўдзел у жыцці беларускай дыяспары ў Польшчы і з'яўляецца адным з заснавальнікаў штогадовага беларускага фэсту «Басовішча». У 2007 годзе Тарасевіч атрымаў Вялікую ўзнагароду Фонду культуры за 2006 год «За істотны ўнёсак у класічны жывапіс і мастацтва ўвогуле». У апублікаваным рэйтынгу 2008 года — адзін з найдаражэйшых польскіх мастакоў, на аўкцыёнах у Польшчы Тарасевіч займаў 10-ю пазіцыю: за ягоную карціну, створаную ў 1985 годзе, калекцыянер заплаціў 150000 злотых (каля 45000 еўра). Карціна не мае назвы і была напісаная пад уражаннем камяністага марскога ўзбярэжжа ў шведскім мястэчку Варнэнас, куды Тарасэвіч быў запрошаны на пленэр.

### ДЗЯНІС ГАРАЖА



Сем залатых медалёў заваявала зборная Беларусі на чэмпіянаце свету па веславанні на байдарках і каноэ ў канадскім горадзе Галіфаксе. У медальным заліку беларуская каманда заняла 2-е месца.

Першыя месцы нашы суайчыннікі занялі ў такіх катэгорыях, як байдарка-чацвёрка на алімпійскай дыстанцыі 1000 м, неалімпійская каноэ-чацвёрка на дыстанцыі 1000 м, байдарка-двойка на алімпійскай дыстанцыі 500 м і на неалімпійскай 200 м; каноэ-чацвёрка на неалімпійскай дыстанцыі 200 м, байдарка-чацвёрка на неалімпійскай дыстанцыі 200 м.

Адзін з залатых медалёў завяваў Дзяніс Гаража ў спаборніцтвах каноэ-адзіночак на алімпійскай дыстанцыі 500 м. Летась спартсмен выйграў першынства планеты сярод моладзі, а затым стаў дарослым чэмпіёнам Беларусі. Увесну трэнеры зборнай узялі хлопца на чэмпіянат Еўропы ў Германію, дзе ён перамог на дыстанцыі ў 500 м.

У балавым заліку беларуская зборная заняла 9-е месца сярод 63 краін (319 балаў). Наперадзе зборныя Венгрыі — 684, Германіі — 681 і Канады — 593 балы. У алімпійскіх дысцыплінах беларусы на 12-й пазіцыі (135 балаў). У лідэрах тут Германія (323), Венгрыя (293) і Іспанія (252).

▸ СПРАВА

# Юрый Лявонаў: СУДОВАЯ І СЛЕДЧАЯ СІСТЭМЫ БЕЛАРУСІ НЕ АДПАВЯДАЮЦЬ НОРМАМ ГРАМАДЗЯНСКАГА ПРАВА

Вольга ХВОІН

**Юрый Лявонаў — адзін з фігурантаў справы «ваўкавыскіх прадпрымальнікаў» — лічыць, што больш не цікавы следству. Паводле меркавання прадпрымальніка, змяненне меры стрымання на падпіску аб нявыездзе азначае заканчэнне следчых дзеянняў у дачыненні да яго. Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка працягваюць знаходзіцца ў следчым ізалятары Мінска на вуліцы Валадарскага.**



**Даведка**

Юрый Лявонаў нарадзіўся ў 1961 годзе ў горадзе Цвер. Скончыў Маскоўскі авіяцыйны інстытут (механік-інжынер ракетных войскаў). У 1992 годзе пасля дзевяці год службы ў ваенна-паветраных сілах звольніўся ў званні капітана. Пераехаў жыць у Ваўкавыск, дзе пазнаёміўся з Мікалаем Аўтуховічам. З 1998 года сумесна з Аўтуховічам займаліся міжнароднымі перавозкамі. З 2003 года на прадпрымальнікаў пачаўся пераслед з боку ўладаў. У 2006 годзе, як і Мікалай Аўтуховіч, быў асуджаны за незаконны занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю і ўхіленне ад выплаты падаткаў. Жанаты, мае дзвюх дачок.

«Я больш не цікавы для следчых органаў, як, зрэшты, не быў цікавы ім і ад пачатку майго арышту», — заявіў прадпрымальнік на першай пасля свайго вызвалення прэсавай канферэнцыі. І дадаў, што з цяжкасцю ўяўляе, чым могуць быць цікавыя следству Мікалай Аўтуховіч і Уладзімір Асіпенка. Юрый Лявонаў падкрэсліваe, што не мае ніякага дачынення да абвінавачванняў у падпале маёмасці ваўкавыскіх чыноўнікаў. Аўтуховіча і Асіпенку ён таксама лічыць невінаватымі па гэтай справе.

Лявонаў сцвярджае, што не валодае інфармацыяй па другой справе аб тэрарызме, якую распачалі супраць Мікалая Аўтуховіча. «Усю інфармацыю наконт гэтага я атрымліваю з недзяржаўных газет, мяне нават не дапытвалі па гэтай справе», — паведаміў прадпрымальнік. Разам з тым Лявонаў надзвычай станоўча ахарактарызаваў Мікалая Аўтуховіча, назваўшы яго неардынарным і мужным чалавекам, які здольны адстойваць свае правы і змагацца. Ён лічыць неабгрунтаванымі закіды Аўтуховічу, што той насамрэч не трымаўся галадоўкі пратэсту (прадпрымальнік патрабаваў або перадаць справу ў суд, або змяніць усім падследным меру стрымання з утрымання пад вартай на падпіску аб нявыездзе) на працягу дзевяноста двух дзён.

«Так можа гаварыць толькі чалавек, які не ведае Мікалая. Я яго ведаю і ведаю, на што ён здольны», — падкрэсліў Лявонаў. Таксама Юрый Лявонаў лічыць, што галадоўка Мікалая Аўтуховіча «падняла справу ваўкавыскіх прадпрымальнікаў на касмічную вышыню», і не ў апошнюю чаргу паўплывала на вызваленне яго з-пад варты. Сваю ролю, паводле Лявонава, адыграла і ўвага да справы прадпрымальнікаў СМІ, амбасадаў краін ЕС, ЗША ў Беларусі.

Расказваючы пра свае ўражанні ад следства, Юрый Лявонаў зазначыў, што цяпер судовая і следчая сістэмы Беларусі не адпавядаюць нормам грамадзянскага права і прынцыпам дэмакратыі. Найперш таму, што перасталі абараняць правы шараговых грамадзян. «У заканадаўстве ёсць такія паняцці, як прэзумпцыя невінаватасці і ўнутраная перакананасць суда. Але яны не працуюць на карысць грамадзян, а толькі каб дагадзіць сістэме, — перакананы Лявонаў. — Я думаю, што другі судовы працэс пойдзе па такім жа сцэнары, як і наш першы ў 2006 годзе. Суддзя не прыме да ўвагі прэзумпцыю невінаватасці, а сваю ўнутраную перакананасць пакладзе на шалі следчых органаў, абвінавачвання. Суд не будзе разглядаць доказы абароны, гэтак жа, як і на першым судовым працэсе, калі нам сказалі, што не бачаць сэнсу далучаць да справы матэрыялы, падрыхтаваныя абаронай».

«Першая справа», пра якую ўзгадаў Юрый Лявонаў, адносіцца да 2006 года. Тады яго і Мікалая Аўтуховіча асудзілі за незаконны занятак прадпрымальніцкай дзейнасцю і ўхіленне ад выплаты падаткаў. Аўтуховіч быў прыгавораны да трох гадоў і шасці месяцаў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці і пазбаўленнем права займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю на працягу пяці гадоў. Юрый Лявонаў, які тады ўзначальваў фірму «Ніка-транс», атрымаў тры гады і пяць месяцаў зняволення ў калоніі ўзмоцненага рэжыму без канфіскацыі маёмасці. Яго, як і Аўтуховіча, пазбавілі права на працягу пяці гадоў займацца прадпрымальніцкай дзейнасцю.

Агульная сума судовых іскаў, якія дагэтуль засталіся нясплочанымі, складала каля аднаго мільёна доляраў.

Юрый Лявонаў не пагаджаецца з меркаваннем, што ў іх цяперашняй справе няма палітыкі. «Сёння бізнес, эканоміка немагчымыя без палітыкі, усе працэсы ў эканоміцы палітызуюцца», — заўважыў прадпрымальнік. Дарэчы, Лявонаў накіроўвае скаргу на імя генпракурора наконт парушэнняў падчас вядзення следства.

У гэтым яго пункт гледжання разыходзяцца з высновамі, якія зрабіў міжнародны эксперт у сферы крымінальнага і крымінальна-працэсуальнага права Марцін Фінке. Доктар Фінке прыйшоў да высноў, што справа ў дачыненні да ваўкавыскіх прадпрымальнікаў расследуецца без юрыдычных парушэнняў і не мае палітычнай падкладкі. «Нашы эксперты не горшыя за еўрапейскіх, але яны не здольныя выказваць сваю думку. У кулуарах гавораць адно, а афіцыйна гэта агучыць не хапае духу», — заўважыў Юрый Лявонаў.

Кіраўнік грамадскай арганізацыі «Цэнтр па правах чалавека» Раіса Міхайлоўская паведаміла, што бліжэйшым часам праваабаронцы накіруюць зварот да кіраўнікоў краін ЕС, ЗША і Расіі з просьбай аказаць садзейнічанне ў незалежным расследаванні справы ваўкавыскіх прадпрымальнікаў, а таксама падтрымаць заклік праваабаронцаў аб правядзенні адкрытага суда над фігурантамі справы «ваўкавыскіх прадпрымальнікаў».




**Даведка**

Мікалая Аўтуховіча, Юрыя Лявонава і Уладзіміра Асіпенку затрымалі сёлета 8 лютага, праз дзесяць дзён ім прад'явілі абвінавачанне па арт. 218 Крымінальнага кодэкса (наўмыснае пашкоджанне маёмасці). 17 ліпеня Міністэрства ўнутраных спраў распаўсюдзіла заяву, што «23 чэрвеня 2009 года галоўным следчым упраўленнем папярэдняга расследавання МУС Рэспублікі Беларусь у дачыненні да Аўтуховіча М. М. і іншых асоб распачата крымінальная справа па арт. 359 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (тэрарыстычны акт) у выглядзе падрыхтоўкі (арт. 13 Крымінальнага кодэкса)». Праваабаронцы Беларусі лічаць ваўкавыскую справу палітычна матываванай, а яе фігурантаў — вязнямі сумлення.

▸ РАЗВАЖАННІ

# КРУГАЗВАРОТ У СІСТЭМЕ

Вольга ХВОІН

**З аднаго боку адпусцілі, з іншага — тузанулі. У выніку баланс палітычнай сістэмы захоўваецца. Быццам бы не ўсё так кепска, але і радаснага мала.**

З добрых навін — амністыя чарговага ўдзельніка «працэсу 14-ці» Аляксандра Баразенкі. Раней пад амністыю патрапілі Міхаіл Пашкеівіч, Павел Вінаградаў, Міхаіл Субач. Алесю Чарнышову і Алесю Стральцову пакаранне абмежаваннем волі замянілі на папраўчыя работы. Тацяна Цішкевіч пасля вынясення прысуду з'ехала вучыцца ў Польшчу, і цяпер пасля перасячэння беларускай мяжы яе, як і Арцёма Дубскага, могуць асудзіць за парушэнне правілаў адбыцця пакарання. Радзіма сустрэне кайданкамі...

З аднаго боку, кіраўніцтва дзяржавы на кожным кроку гаворыць пра дэбюракратызацыю і антыкарупцыйную кампанію — раз-пораз з'яўляецца інфармацыя пра судовыя працэсы над кіраўнікамі прадпрыемстваў, якіх абвінавачваюць у хабары. З другога — як ладану баіцца антыкарупцыйных настрояў у грамадстве. Суд Баранавічаў пакараў штрафамі актывістаў незарэгістраванай арганізацыі «Малады фронт» Арцёма Ластавецкага, Пятра Рузава, Сямёна Былінскага і Юрыя Багдановіча за расцяжку «Не — карупцыі». Няма логікі ў дзеяннях уладаў — апазіцыю не любіць і падтрымкі народнай не хочуць.

Класіка жанру: хочаш штраф — вазьмі ў рукі нацыянальны, гістарычны бел-чырвона-белы сцяг і атрымай спагнанне. Для разнастайнасці можна караць і за сцяг Еўрасаюза. Адміністрацыйная камісія Савецкага раёна Гомеля аштрафавала актывістку руху «За свабоду» Зінаіду Шуміліну на 175 тысяч рублёў. Чальцы камісіі і яе старшыня, намеснік кіраўніка адміністрацыі раёну Міхаіл Шышкоў, палічылі, што спадарыня Шуміліна не мела права вывешваць на сваім прыватным доме беларускі нацыянальны сцяг і сцяг ЕС, а таксама расцяжку «Галадоўка пратэсту». А пасольствам краін ЕС вывешваць сіні сцяг з зорачкамі дазволена, дый чыноўнікаў пад шумок «лібералізацыі» бачылі на фоне гэтага сцяга. Але што дазволена Юпіцеру...

Перманентная цікая барацьба вядзецца з пратэстантамі: то пастыраў вышлюць, то суполку ліквідуюць, то будынак царквы адабраць пагражаюць. Чарговая эпапея з храмам мінскай пратэстанцкай суполкі «Новае жыццё» — судовыя выканаўцы ўручылі распараджэнне аб тым, што паводле рашэння Вышэйшага гаспадарчага суда вернікі мусяць вынесці сваю маёмасць і да 21 жніўня пакінуць свой храм — былы калгасны кароўнік на ўскрайку Мінску. Вернікі, згубіўшы надзею адстаяць сваю маёмасць (кароўнік выкуплены і адрамантаваны за кошт прыхаджан), вырашылі звярнуцца за падтрымкай у міжнародныя структуры. Дарэчы, эпапея з гэтым кароўнікам-храмам доўжыцца некалькі гадоў: і судзіліся, і галадалі, а вось жа нічога нікому тут не даказалі...

Гавораць, што няма ў Беларусі палітвязняў. Але міжнародная праваабарончая арганізацыя «Amnesty International» лічыць інакш. У месцах не надта далёкіх знаходзіцца Арцём Дубскі, які быў асуджаны да года пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму за парушэнне правілаў адбыцця пакарання па «справе 14-ці» за ўдзел у акцыі пратэсту прадпрымальнікаў зімой 2008 года. Мець палітвязняў іміджава няправільна, але эканамічна выгадна. Пры нагодзе можна парачку новых набраць, а старых выпусціць, ды яшчэ крэдыт атрымаць ці казырнуць, што цяпер Беларусь — не тэрыторыя рэжыму, а «белая і пухнатая». Баланс, адным словам.

БЕЛЛЕГПРАМ

# СКЛАДСКІЯ ЗАПАСЫ НА ПРОДАЖ

Алена ЗАПАЛЯНСКАЯ

**Ва ўмовах крызісу канцэрн «Беллегпрам» гатовы зніжаць кошты і чакае супрацоўніцтва з прыватным бізнесам ды інвестараў. Складскія запасы гатовай прадукцыі пры гэтым пакрысе, але зніжаюцца. Пра гэта распавялі журналістам начальнік упраўлення каардынацыі развіцця скурана-абутковай галіны Ларыса Харытон і начальнік аддзела ўпраўлення якасці, маркетынгу і таварапрасоўвання канцэрна «Беллегпрам» Людміла Пархамовіч.**

«Такая праблема — наяўнасць звышнарматыўнай колькасці складскіх запасаў — існуе. Але зараз назіраецца тэндэнцыя да іх зніжэння», — падкрэсліла Пархамовіч. Яна патлумачыла, што за ліпень запасы гатовай прадукцыі прадпрыемстваў канцэрна знізіліся на 4 мільярда рублёў (ці на 2 працэнты). «На першы погляд, лічба падаецца нязначнай, але для нас гэта вельмі важна — ліпень складаны месяц для лёгкай прамысловасці», — адзначыла начальніца аддзелу, нагадаўшы пра сезоннасць.

Ужо вядома, што па стане на 18 жніўня складскія запасы знізіліся яшчэ на 9 мільярдаў рублёў, ці на 1,8 працэнта. Агульная колькасць запасаў пры гэтым складала 490 мільярдаў рублёў.

Найбольшых поспехаў у жніўні дасягнула «Мілавіца», ёй удалося распрадаць прадукцыі на 3 мільярды рублёў, а «Элеме» — на 1,5 мільярда. Пархамовіч не лічыць беларускую лёгкую прамысловасць самай затаваранай. Акрамя таго, па яе меркаванню, наяўнасць усяго мадэльнага шэрагу на складзе дазваляе прадставіць яго ў поўнай меры пакупнікам.

Крызіс прымушае канцэрн быць больш гнуткім. Так, па словах Людмілы Пархамовіч, «Беллегпрам» актыўна супрацоўнічае з індывідуальнымі прадпрымальнікамі. «Мы працуем з ІП. Гэта вельмі вялікі пласт, які мог бы супрацоўнічаць з нашымі прадпрыемствамі», — адзначыла яна. Прадстаўнік канцэрну расказала пра сустрэчу з ІП, дзе абмяркоўваліся ўмовы ўзаемадзеяння.

У той час, як, па словах журналістаў, ІП не вельмі задаволеныя супрацоўніцтвам з прадпрыемствамі канцэрну, беларускія ўлады рыхтуюць нарматыўна-прававы акт для актывізацыі рэалізацыі тавараў «Беллегпрама» індывідуальнымі прадпрымальнікамі. Па словах Людмілы Пархамовіч, напрыклад, разглядаецца магчымасць замест перадаплаты ўвядзення страхавання прадпрымальніцкіх рызыкаў пры супрацоўніцтве з малым бізнесам. Акрамя таго, можа быць спрошчаная працэдура водпуску ім тавару і забяспечана суправаджэнне. Пакуль жа практыкуецца індывідуальны падыход. «Думаю, умовы аплаты ІП за прадукцыю будуць вызначаныя ў індывідуальным парадку, і не абавязкова гэта будзе перадаплата», — распавяла Пархамовіч. У прыватнасці, сёння, па яе словах, кожная чацвёртая пара абутку з фабрыкі «Луч» прадаецца прадпрымальнікамі. Актыўна супрацоўнічае з ІП і Брэсцкі панчошны камбінат.

Чакае канцэрн і замежных інвестараў. Пакуль што дасягненні ў гэтым накірунку невялікія: расійскі прадпрымальнік выкупіў запазычанасці Баранавіцкай абутковай фабрыкі і пазбавіўся ад складскіх запасаў радыкальна — распрадаў абутак за 7–10 тысяч беларускіх рублёў. Сярод прадпрыемстваў, якім інвестыцыі патрэбныя больш за ўсіх, начальнік упраўлення каардынацыі развіцця скурана-абутковай галіны Ларыса Харытон назвала Лідскую абутковую фабрыку.

Супрацоўнікі канцэрну былі аптымістычныя наконт перспектыў працы. Па меркаванню Пархамовіч, ёсць надзея, што да канца года ўдасца выйсці на даведзены нарматыў.

КРЫЗІС

# ЧЫМ ТАННЕЙ — ТЫМ ЛЕПШ

Вольга ЛІСІЧОНАК

**Неяк газета «Рэспубліка» парадавала сваіх чытачоў публікацыяй антыкрызіснага меню для беларусаў. Аўтарка артыкула Паліна Канага перакананая, чым больш таннае харчаванне — тым лепш.**

Для прыкладу, замест свініны і ялавічыны можна есці танныя замяняльнікі бялкоў, а ўвесь неабходны букет вітамінаў арганізм беларуса цалкам здольны атрымаць ад узмоцненага паядання морквы, капусты і буракоў. Гурманаў у артыкуле таксама не забылі. Ім спецыялісты раяць такія даступныя далікатэсы, як мойва і кілька. Што тычыцца зяляніны, то яе можна і на падваконні вырошчваць.

Дык вось, калі набываць правільныя прадукты, то аўтарка гарантуе, што грошы ў сям'і застануцца на больш патрэбныя рэчы. Паводле падлікаў Паліны Канага, месячнае харчаванне для дарослага чалавека ва ўмовах крызісу можна абмежаваць усяго толькі 230–270 тысячамі рублёў.

Заходнія ж дыетолагі па невядомых прычынах настойваюць, што ва ўмовах крызісу можна ашчаджаць на чым заўгодна, толькі не на ежы. Амерыканскія спецыялісты, для прыкладу, заяўляюць, што ва ўмовах сусветных катаклізмаў пачынаецца перыяд стрэсаў, якія і без эканоміі ў ежы адмоўна ўплываюць на страваванне. Часопіс «Forbes» апублікаваў спіс самых карысных прадуктаў, неабходных чалавеку. У іх ліку — ягады, арэхі, бабовыя, мяса, малако і яйкі. Цвіком праграмы, паводле «Forbes», з'яўляюцца гранаты і гранатавы сок.

Чаму ў пераліку «Рэспублікі» такіх прадуктаў няма, можна, мяркую, здагадацца. Нават пры ўсёй сваёй ашчаднасці антыкрызіснае меню ну ніяк не лезе ў межы сярэдняга заробка беларусаў. Прапаную заняцца арыфметыкай. Сярэдняя беларуская зарплата складае 250 долараў. Па-за межамі пражытачнага мінімуму жывуць 12,1 працэнта беларускіх сямей, то бок амаль кожны восьмы беларус траціць на сябе менш за 158 тысяч рублёў у месяц. А ў бюджэт пражытачнага мінімуму ўваходзіць не толькі харчаванне, але і адзенне, абутак, лекі, транспарт, выдаткі на камунальныя паслугі. Больш за ўсё такіх сямей пражывае ў Гомельскай вобласці — кожная шостая. Менш за ўсё ў Мінскай — усяго 3,4 працэнта.

Аказваецца, большая частка жыхароў краіны не можа дазволіць сабе сярэдні заробак у 250 долараў на аднаго чалавека. Напачатку года сярэдні даход на аднаго чалавека ў 7,1 працэнта беларусаў быў менш за 130 тысяч рублёў. Амаль траціна сямей (36,8 %) выдаткоўвае на кожнага сямейніка 130–250 тысяч у месяц. А 46,4 працэнта — ад 250 да 500 тысяч беларускіх рублёў. Сямей, у якіх на кожнага прыходзіцца па 250 долараў у месяц, у Беларусі значна менш, чым тых, хто жыве па-за межамі беднасці. Усяго 9,7 працэнта могуць патраціць больш за 500 тысяч на кожнага члена сям'і. Амаль усе яны жывуць у Мінску.

Менш за беларусаў атрымліваюць хіба толькі нашы паўднёвыя суседзі — украінцы. Там чалавек зарабляе 219 долараў. Сярэдні расіянін атрымлівае 459 долараў; літоўцы — 946, палякі — 1045, латышы — 900 долараў.

## НАВІНЫ ЭКАНОМІКІ

### МВФ ПРАЦУЕ

**У Мінску пачала працу група экспертаў Міжнароднага валютнага фонду на чале з кіраўніком місіі МВФ па Беларусі Крыстаферам Джарвісам.**




Як паведамілі ў прадстаўніцтве фонду, місія павінна ацаніць ход выканання беларускім урадам праграмы, якая падтрымліваецца крэдытам stand-by у агульным памеры 3,52 мільярда долараў ЗША. Эксперты фонду таксама правядуць кансультацыі па развіцці беларускай эканомікі за мінулы год і перспектывах на будучыню. Чакаецца, што для ўдзелу ў гэтых кансультацыях Беларусь 24–26 жніўня наведае дырэктар еўрапейскага дэпартамента МВФ Марэк Белька.

У межах працы місіі запланаваныя сустрэчы ва ўрадзе Беларусі, Нацыянальным банку, міністэрствах эканомікі і фінансаў, Адміністрацыі прэзідэнта. Прадугледжаны таксама сустрэчы Белькі з вышэйшымі дзяржаўнымі чыноўнікамі Беларусі.

Беларусь звярнулася па атрыманне крэдыту да МВФ у кастрычніку 2008 года. У студзені 2009 года кіраўніцтва МВФ ухваліла праграму stand-by для Беларусі ў аб'ёме каля 2,46 мільярда долараў пад праграму эканамічных рэформаў, разлічаную на 15 месяцаў (да красавіка 2010 года). Першы транш крэдыту ў 788 мільёнаў долараў ЗША па стаўцы LIBOR плюс 0,75% гадавых паступіў у Беларусь 14 студзеня, астатнія сродкі пералічваюцца з улікам штоквартальных справаздач беларускага ўрада.

29 чэрвеня Савет дырэктараў МВФ завяршыў першы агляд у межах дамоўленасці з уладамі Беларусі аб крэдыце stand-by. Пры гэтым фонд зацвердзіў выдачу чарговага траншу крэдыту ў памеры 679,2 мільёна долараў ЗША і павялічыў у цэлым аб'ём фінансавай падтрымкі на 1 мільярд долараў — да 3,52 мільярда.

Другі транш крэдыту МВФ паступіў у Беларусь 2 ліпеня. Да канца года Нацбанк разлічвае атрымаць ад Міжнароднага валютнага фонду яшчэ два траншы на суму 1,35 мільярда долараў стабілізацыйнага крэдыту.

### РЭКЛАМУ ПРЫПЫНІЛІ

**Упраўленне абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Беларусі накіравала ліст брэндынгавай кампаніі A.I.D.A Pioneer з прадпісаннем часова прыпыніць пракат на тэлебачанні рэкламнага роліка піва «Тэма».**




Як паведаміў крэатыўны дырэктар кампаніі Дзмітрый Апаленіс, рэкламны ролік «25» моладзевага піва «Тэма» (вытворчасць ААТ «Лідскае піва»), які паказвалі на музычным і некаторых цэнтральных беларускіх каналах, Мінгандлю палічыла неэтычным. «Пытанні ўзніклі адносна магчымай двухсэнсоўнай трактоўкі сюжэта, — растлумачыў Апаленіс. — Размова дзвюх дзяўчын пра памер піўной бутэлькі выклікала дадатковыя асацыяцыі прадстаўнікоў кантрольных органаў. Адпаведна яркая і запамінальная кампанія была прымусова спынена як мінімум на месяц. За гэты час Мінгандлю павінна вынесці рашэнне: адпавядае ролік маральна-этычным нормам заканадаўства Беларусі ці не».

Начальнік упраўлення абароны правоў спажыўцоў і кантролю за рэкламай Міністэрства гандлю Ірына Барышнікава паведаміла, што рэкламны ролік «25» гандлёвай маркі «Тэма» накіраваны на экспертызу ў Міністэрства культуры, Інстытут мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук і грамадскае аб'яднанне па абароне правоў спажыўцоў. Паводле вынікаў экспертызы будзе вынесена рашэнне: ці дапушчана ў роліку парушэнне заканадаўства.

На думку Барышнікавай, у гэтай рэкламе аўтары перайшлі пэўныя маральныя межы ў давядзенні інфармацыі да спажыўца. «Звычайна, калі мы сумняваемся, мы не здымаем ролік з пракату, але ў гэтым выпадку вырашылі прыпыніць дэманстрацыю — гэта ўжо занадта!» — заявіла прадстаўнік Мінгандлю.

У сваю чаргу, Дзмітрый Апаленіс выказаў шкадаванне наконт таго, што рэкламная кампанія брэнда «Тэма» спынена, нягледзячы на адсутнасць парушэння «піўнога заканадаўства» — юрыдычныя службы тэлеканалаў прапусцілі ролік у эфір без прэтэнзій. «Паводле такой схемы можна спыніць абсалютна любую кампанію. Нават у белым лісце можна знайсці іншы сэнс, камусьці можа падацца, што ён не адпавядае агульнапрызнаным маральным і этычным нормам», — сказаў Апаленіс.

**Паводле БелаПАН**

ВІЗІТ

# ВЫВЕДКА НА МЕСЦЫ

Марыя КРУК

**З аднадзённым візітам 14 жніўня Мінск наведаў памочнік дзяржаўнага сакратара ЗША Філіп Гордан. Па выніках шэрагу сустрэч гучных заяў і высноў зроблена не было. Эксперты губляюцца ў здагадках: ці амерыканскі палітык папросту разведваў абстаноўку, ці ўсё ж зрабіў беларускім уладам важныя прапановы. Аднак адно бясспрэчна: са зменай кіраўніцтва ў Белым доме ўвага да Беларусі не сышла на нуль і пераемнасць у знешняй палітыцы да нашай краіны захавалася.**



Прадстаўнік дзяржаўнага дэпартамента сустрэўся з кіраўніком Адміністрацыі прэзідэнта Беларусі Уладзімірам Макеем і міністрам замежных спраў Рэспублікі Беларусь Сяргеем Мартынавым. Афіцыйныя паведамленні гавораць, што падчас гэтых сустрэчаў былі «абмеркаваныя пытанні развіцця беларуска-амерыканскіх адносін, у тым ліку выкарыстання наяўных магчымасцяў па пашырэнні гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва», а таксама «грунтоўны абмен меркаваннямі па пытаннях шматбаковага супрацоўніцтва, узаемадзеяння ў сферы міжнароднай бяспекі і раззбраенні. Бакі дамовіліся падтрымліваць рэгулярныя кантакты».

Перад сустрэчай з прадстаўнікамі ўлады Філіп Гордан даведаўся і пра неафіцыйныя пункты погляду на цяперашнюю ўнутраную і знешнюю палітыку Беларусі: памочнік дзяржсакратара ЗША сустрэўся з экс-кандыдатам у прэзідэнты Беларусі Аляксандрам Казуліным, кіраўніком Аб'яднанай грамадзянскай партыі Анатолем Лябедзькам, намеснікам старшыні Партыі БНФ Вінцуком Вячоркам, кіраўніком Партыі камуністаў беларускай Сяргеем Калякіным, намеснікам кіраўніка руху «За свабоду» Віктарам Карнеенкам, старшынёй Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатолем Ляўковічам, лідэрам арганізацыі «Маладыя дэмакраты» Міхаілам Пашкевічам, сустаршынёй партыі «Беларуская хрысціянская дэмакратыя» Віталем Рымашэўскім і праваабаронцам Валянцінам Стэфановічам.

Такім чынам, амерыканскі палітык прыйшоў у Адміністрацыю прэзідэнта і МЗС са свежай інфармацыяй па актуальных пытаннях. Падчас сустрэчы ўздымаліся тэмы свабоды асацыяцый, СМІ, моладзевай палітыкі, палітвязняў. Найперш госця прасілі звярнуць увагу на крымінальныя справы, заведзеныя ў дачыненні да ваўкавыскіх прадпрымальнікаў Мікалая Аўтуховіча, Уладзіміра Асіпенкі і Юрыя Лявонава, моладзевага актывіста Арцёма Дубскага, фігурантаў «справы 14-ці», якіх арганізацыя «Amnesty International» прызнала вязнямі сумлення.

Дарэчы, намеснік дзяржсакратара заявіў, што пазіцыя ЗША ў дачыненні да сітуацыі ў Беларусі застаецца нязменнай і ніякага гандлю дэмакратычнымі каштоўнасцямі не будзе. Па меркаванню Гордана, ва ўмовах крызісу беларускія ўлады здзяйсняюць некаторыя крокі ў бок дэмакратызацыі грамадства і прытрымлівання правоў і свабодаў грамадзян, але гэтыя крокі павінны быць больш значнымі.

«Відавочна, што сустрэча з прадстаўнікамі апазіцыі для Філіпа Гордана мела кансультатыўны характар перад асноўнымі сустрэчамі з урадаўцамі, — дзеліцца сваімі ўражаннямі лідэр «Маладых дэмакратаў» Міхаіл Пашкевіч. — Разам з тым, Гордан быў добра абазнаны ў нашых праблемах, адчувалася веданне тэмы. Немалаважна і тое, што не паўтарыўся сцэнар прыезду еўрачыноўнікаў, калі прадстаўнікам апазіцыі даваліся гучныя абяцанні, але ўжо праз пару гадзін яны парушаліся».

Не так даўно кіраўнік Беларусі заявіў, што поўнае зняцце эканамічных санкцый Вашынгтонам будзе ацэнена як сігнал для паўнавартаснага аднаўлення ўзаемнай дыпламатычнай прысутнасці. Тады ж Лукашэнка заўважыў, што новая адміністрацыя ЗША дэманструе накіраванасць на больш адказную ролю ў зменлівым свеце. «Спадзяюся, гэты працэс у пазітыўным рэчышчы закране і Беларусь... Мы прапануем Амерыцы прадметна-канструктыўны дыялог па шырокім коле актуальных пытанняў і першымі гатовыя працягнуць руку для аднаўлення клімату паразумення і даверу», — заявіў беларускі лідэр. Візіт Філіпа Гордана прадставіў шанец прадэманстраваць гэтую саму працягнутую руку. Відавочна, што ва ўмовах эканамічнай нестабільнасці пытанне эканамічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ЗША наўрад ці было праігнараванае. Аднак зноў жа афіцыйныя паведамленні не ўтрымлівалі інфармацыі пра канкрэтныя дамовы.

Сам характар сустрэчы паказвае, што Штаты не паставілі крыж на Беларусі і ў прынцыпе гатовыя да падтрымання дыпламатычных адносінаў, але пры ўмове, калі апошняя не будзе заходзіць за «чырвоныя сцяжкі».

ВОДГУК

# АДНА ТЭМА — РОЗНЫЯ ПОГЛЯДЫ

**У 26-м нумары «Новага часу» быў апублікаваны артыкул Івана Біча «Польскі аналаг Дахау» — пра гісторыю стварэння і функцыянавання турмы ў Бярозе-Картузскай на тэрыторыі Заходняй Беларусі.**

Існавала турма нядоўга — з ліпеня 1934-га да восені 1939 года — калі была ліквідавана Чырвонай арміяй, што ўвайшла на тэрыторыю Заходняй Беларусі. Так гісторыя турмы аказалася ўпісанай у складаны і драматычны адрэзак не толькі польскай, але сусветнай гісторыі, на сутыкненні эпох, на лязе дзвюх войнаў, супрацьстаянні двух таталітарных рэжымаў за сваё глабальнае гаспадарства.

Рэха тых падзей да гэтага часу адгукаецца ў беларуска-польскіх адносінах. І таму не выпадкова, што і праз 75 гадоў гісторыя гэтай турмы выклікае цікавасць як даследчыкаў, так і грамадскасці. Найперш у Польшчы.

На артыкул Івана Біча адгукнуўся Павел Марчук, першы



сакратар польскай амбасады ў Беларусі. Мы публікуем яго ліст, а па сутнасці — глыбокі, аргументаваны артыкул, цалкам.

Два артыкулы цікавыя не толькі сваім зместам. Беларускі журналіст Іван Біч у сваім нарысе адлюстраваў, абагульнішы на польскіх жа крыніцах, пункт погляду пэўнай групы польскіх даследчыкаў. Павел Марчук выклаў свой. І гэта — самае галоўнае і істотнае: драматычныя і складаныя з'явы гісторыі, як нацыянальнай, так і сусветнай, у дэмакратычнай Польшчы даследуюцца, вывучаюцца, дыскутуюцца адкрыта. Там даўно няма зон пад забаронай, табу на тыя ці іншыя тэмы, закрытых спецсховішч. Там даўно і плённа працуе Інстытут памяці, намаганнямі якога вернуты з нябыту тысячы імён і падзей. Праўда гісторыі паўстае са свабоды слова.

Іншая справа — у Беларусі. Па сутнасці, любая гістарычная тэма знаходзіцца пад знакам калі не афіцыйнай забароны, то пад дзяржаўным кантролем. Табу — на тэме рэпрэсій 1930–1950-х гадоў. Табу на тэме Курапат. Табу на тэме пакту Молатава-Рыбентропа. Прапагандысцкія фільтры — на тэме паходу Чырвонай арміі па далучэнні Заходняй Беларусі ў склад БССР... І толькі намаганнямі энтузіястаў-даследчыкаў мы ўсё ж такі ажыццяўляем свае лакальныя прарывы да праўды гісторыі. І гэты інтэлектуальны рух не стрымаць, не спыніць.

**Аляксей Кароль,**
**шэф-рэдактар «Новага часу»**

## Шаноўны спадар Іван БІЧ

Я не маю намеру палемізаваць са зместам артыкула, аднак хацеў бы выказаць свае адносіны да галоўнага тэзіса, які стаў падставай для далейшых развашэнняў аўтара.

На грэчаскай мове «analogos» азначае «прапарцыянальны», «падобны». Прапаную паглядзець, якім чынам гэтае падабенства прадстаўлена ў свеце гістарычнай інфармацыі і фактаў, змешчаных у артыкуле.

Створаны ў 1933 годзе канцэнтрацыйны лагер у Дахау (які можна было б назваць прататыпам лагераў з двацдацць гадоў, каб не створаны ў СССР у 1923 годзе канцэнтрацыйны лагер на Салавецкіх астравах), першапачаткова быў прызначаны для ўдзельнікаў нямецкай апазіцыі, аднак хутка да гэтай групы былі далучаны ворагі нацысцкай сістэмы і асобы, якія лічыліся непрыгоднымі для гэтай сістэмы.

Увогуле, канцэнтрацыйны лагер Дахау стаў адным з прыкладаў, побач з Аўшвіцам (1 100 000 закатаваных), практычнай рэалізацыі нацысцкай палітыкі, інструментам гітлераўскай расавай палітыкі, адным з сімвалаў халакосту і немагчымага для ўяўлення варварства другой сусветнай вайны.

Усяго праз канцэнтрацыйны лагер Дахау прайшло 250 000 вязняў, у тым ліку закатавана — 148 000 чалавек.

З самага пачатку мэтай Дахау было масавае вынішчэнне адразу ўнутраных ворагаў, затым, згодна з асноўнымі палажэннямі, прадстаўленымі ў «Main kampf» Адольфа Гітлера, ніжэйшых расаў, у тым ліку жыдоў, славян і раманскай расы, а таксама ворагаў (у шырокім разуменні гэтага слова) Трэцяга рэйха.

У лагеры праводзіліся псеўдамедычныя эксперыменты. Удзел у іх прымалі такія прадстаўнікі нацысцкай навукі, як праф. Клаус Шылінг, доктар Зігмунт Рашэр, праф. Эрык Хіпке, праф. Аўгуст Вэльц, доктар Хэйнрых Шуц.

Адначасова з вынішчальнымі функцыямі (якія дыктаваліся іманентнай для нацызму расісцкай ідэалогіяй), канцэнтрацыйны лагер у Дахау быў адным са шматлікіх звенняў, якія выкарыстоўвалі нявольніцкую працу вязняў на патрэбы ваеннай вытворчасці Трэцяга рэйха, быў адной з яе апораў.

Аднак «Месца адасаблення», бо такой была афіцыйная назва «Бярозы-Картузскай» — бясспрэчнай плямы на гонары Другой Рэчы Паспалітай — было праяўленнем бяссілля маладой польскай дзяржавы перад нарастаючымі праблемамі, звязанымі з утрыманнем інтэгральнасці, як і перад нарастаючай праблемай нацыянальных меншасцяў (вельмі часта распальваемая ўсходнім суседам — сёння мы маем дастаткова гістарыяграфічнай інфармацыі на дадзеную тэму).

Туды траплялі (паводле сённяшніх крытэрыяў) тэрарысты і асобы, якіх падазравалі ў сабатажы і працы на карысць іншых дзяржаў, а таксама, на жаль, прадстаўнікі левага крыла і скрайняга правага крыла, дзеячы паўстаючага на польскіх землях беларускага і ўкраінскага народных рухаў, тыя, хто пазбягаў платы падаткаў, падазраваныя ў фінансавых надужываннях, крыміналісты, а ў апошняй фазе існавання лагера, якая папярэднічала выбуху другой сусветнай вайны, — прадстаўнікі нямецкай меншасці.

Большасць вязняў Бярозы-Картузскай вядомыя па прозвішчах і імёнах, можна прасачыць іх біяграфіі, каб зразумець генезіс узнікнення «месца адасаблення».

Агульная лічба ахвяраў Бярозы-Картузскай — 14 чалавек (10 заключаных памерлі ва ўнутраным шпіталі, тры — у самой турме, адзін учыніў самазабойства).

Асноўная розніца паміж Бярозай-Картузскай і Дахау заключаецца не толькі ў радыкальна розных лічбах ахвяраў, але ў генезісе і канчатковых функцыях гэтых двух месцаў.

Таксама нельга забываць пра сітуацыю, што ў момант утварэння турмы ў Бярозе-Картузскай існавала ў Еўропе, і якая мела непасрэдны ўплыў на рашэнне пра яе ўтварэнне ў 1934 годзе.

Нагадаю: на захадзе ўсё мацнейшая і ваяўніча настроеная фашысцкая Германія, на ўсходзе — Савецкі Саюз, які не хаваў сваіх агрэсіўных намераў адносна Рэчы Паспалітай, і які ўваходзіў у фазу вялікага тэрору (7–8 мільёнаў арыштаваных, 1–1,5 мільёна расстраляных, 2 мільёна закатаваных у сталінскіх лагерах).

На савецкай Украіне заканчвалася другая хваля Вялікага Голаду (1921–1923, 1932–1933, 1946–1947 — які, па розных падліках, забраў жыцці 6–15 мільёнаў людзей), таксама абавязваў дэкрэт «аб пяці каласах». У лесе ў Курапатах закопвалі чарговых «ворагаў народа». У 1937 годзе загад № 00485 — які быў фактычным указаннем вынішчэння палякаў у СССР і ў выніку якога закатавана сто тысяч чалавек — быў падпісаны Н. Яжовым.

Такім чынам, параўноўванне Бярозы-Картузскай з Дахау з'яўляецца надужываннем і зваротам да асноваў савецкай гістарыяграфіі, якая, у сувязі са сваёй супярэчнасцю з элементарным журналісцкім аб'ектывізмам, не да твару незалежнаму журналісту і аднаму з вядучых незалежных беларускіх штотыднёвікаў.

**З павагай, Першы сакратар амбасады Рэспублікі Польшча ў Беларусі Павел Марчук**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 26 ЖНІЎНЯ, СЕРАДА

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05** Серыял «Свой-чужы» (Расія).
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**10.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія).
**11.40** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША).
**12.55** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.40** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.50** Авантурна-прыгодніцкі серыял «Каралі гульні» (Расія). 1-я серыя.
**16.55** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці».
**17.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія).
**18.40** Відэафільм АТН «Спадчына зямлі Аршанскай» цыкла «Зямля беларуская».
**19.30** Відэафільм АТН «Планета гольфа: ЗША».
**19.55** Серыял «Свой-чужы» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда. Прамая трансляцыя.
**00.00** Дзень спорту.
**00.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд.
**01.05** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

**06.00, 07.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.30** «Дарагая перадача».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.50** «Асабістая цікавасць» з Паўлам Каранеўскім.
**14.15** «Далёкія сваякі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот 2». Серыял.
**16.50** «Нацыянальны здабытак». Народныя рамёствы.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**21.30** «Крот 2». Серыял.
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Калі ласка, скардзіцеся».
**23.25** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**00.15** «Next 2». Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Серыял «Аплачана смерцю» (Расія).
**09.05** У гэты дзень.
**09.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.10** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**11.15** Свая музыка.
**11.40** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**12.30** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША).
**13.55** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў.
**14.45** Дак.-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно. Мацільда Мэй» (Францыя).
**15.10** Мультсерыял (Японія).
**15.55** Пазакласная гадзіна.
**16.05** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія).
**19.00** Дак.-камедыйны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада). 3-я серыя.
**19.30** Беларускае «времечко».
**20.25** Калыханка.
**20.45** Экспедыцыя.
**20.50** Дэтэктыўны серыял «Аплачана смерцю» (Расія).
**21.40** Іншыя. Псіхалогія крыміналу.
**22.10** Камедыя «Вар'яты падмосткі».
**23.55** М-1. Беларуская адкрытая ліга прафесійных баёў. Фінал.

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял, Расія, 2008 г.
**10.05** «Юродзівыя». Дак. фільм.
**11.00, 14.00, 17.00, 19.00** Весткі.
**11.30** «Вышэйшы пілатаж». Расія, 2009 г. Заключная серыя.
**12.30** «Аніскін і Фантамас».2-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** Прэм'ера. «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** Тэлесерыял «Тайга».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.30** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** Тэлесерыял «Цыганачка з выхадам».
**22.30** «Лініі лёсу».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «Весткі+».
**00.00** «Лятаючыя талеркі Трэцяга рэйха». Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00, 10.00, 13.00, 16.00, 19.00, 23.15** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.05** Меладраматычны серыял «Толькі ты...».
**08.55** «Рускія сенсацыі»: «Рэпартаж з таго свету».
**09.40** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**10.25** «Выратавальнікі».
**10.50** «Асабліва небяспечны!».
**11.20** Серыял «Ментоўскія войны».
**12.10** «Сярэдні клас».
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.30** Серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.25** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-офф адборачнага раўнда. Штутгарт (Германія)-Цімашаара (Румынія).
**01.30** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Футбол. Чэмпіянат свету сярод моладзевых каманд. Егіпет. Прэв'ю.
**09.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Англія - Італія (Фінляндыя).
**11.15** Пляжны футбол. Еўраліга. Групавы этап. Віла-Рэал (Партугалія).
**12.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Швецыя - Расія (Фінляндыя).
**13.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**14.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Англія - Італія (Фінляндыя).
**16.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Швецыя - Расія (Фінляндыя).
**17.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Украіна - Данія (Фінляндыя).
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Нідэрланды - Фінляндыя. Тампере (Фінляндыя).
**22.10** Абранае па серадах.
**22.15** Пола. Адкрыты чэмпіянат ЗША.
**23.15** Навіны коннага спорту.
**23.20** Гольф. The Crown Family.
**23.30** Гольф. Адкрыты чэмпіянат KLM.
**00.00** Гольф. Тур PGA. Чэмпіянат Wyndham. Грынсбара (ЗША).
**00.55** Гольф клуб. Навіны гольфа.
**01.00** Абранае па серадах.
**01.05** Яхт клуб. Навіны ветразевага спорту.
**01.15** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Украіна - Данія (Фінляндыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**09.40** «Народы Беларусі ў Гродна», дак. фільм, рэж. Мікалай Ваўранюк, 2008 г.
**20.10** Хто ёсць кім: Вольга Іпатава.
**20.20** Праект «Будучыня».
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Усяслаў Чарадзей» (пазнавальная праграма).
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Недасканалае злачынства», маст. фільм, 2004 г., Іспанія.
**22.55** Аб'ектыў.

## 27 ЖНІЎНЯ, ЧАЦВЕР

**05.35** Серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05** Дзень спорту.
**06.10, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.30** Відэафільм АТН «Вучыце албанскі».
**09.05** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія).
**10.00** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**10.45** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія).
**11.35** «OFF STAGE LIFE».
**12.10** Моладзевы серыял «Начныя агні пятніцы» (ЗША).
**12.55** Фантастычны серыял «Героі» (ЗША).
**13.40** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**14.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Эпоха».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.55** Авантурна-прыгодніцкі серыял «Каралі гульні» (Расія). 2-я серыя.
**16.50** Меладрама «Тэрыторыя прыгажосці» (Украіна).
**17.40** Крымінальная меладрама «Заўсёды кажы «заўсёды»-2» (Расія).
**18.40** Відэафільм АТН «Бярэзінскі запаведнік» цыкла «Зямля беларуская».
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Вострасюжэтны серыял «Свой-чужы» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Драматычны серыял «Доктар Хаўс».
**23.30** Дакументальна-біяграфічны цыкл «Мая праўда» (Украіна). Фільм «Ціна Кандэлакі».
**00.25** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.05** «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.40** «Ералаш».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.45** «Модны прысуд».
**14.45** «Жадаю ведаць» з Міхаілам Шырвіндтам.
**15.10** «Гарачы лёд». Шматсерыйны фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Прынцэса цырка». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** «Мая выдатная няня». 2004 год.
**18.55** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Прэм'ера. «Адна сям'я». Шматсерыйны фільм.
**22.05** «Выратуй мяне». Шматсер. фільм.
**23.00** Нашы навіны.
**23.15** Навіны спорту.
**23.20** «Жанатыя... з дзецьмі». Шматсерыйны фільм.
**00.15** «Без розуму ад цябе». Шматсер. фільм.
**01.05** Нашы навіны.
**01.20** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Калі ласка, скардзіцеся».
**08.50** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Танга ўтрох».
**11.30** «Далёкія сваякі».
**11.45** «Званая вячэра».
**12.35** «Жаданая». Серыял.
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Прыватныя гісторыі».
**14.40** «Гадкае качаня». Моладзевы серыял.
**15.30** «Крот 2». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэпарцёр СТБ». Лепшае.
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.30** «Жаданая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** «КДБ у смокінгу». Серыял.
**21.30** «Крот 2». Серыял. Закл. серыя.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Аўтапанарама».
**23.25** «Гарачы лёд».
**23.50** «Сакрэтныя гісторыі».
**00.40** «Next 2». Серыял.

**06.55** Добрая раніца.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Аплачана смерцю» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**10.15** Серыял «Каханне як каханне» (Расія). 3-я серыя.
**11.15** Серыял «Дзве сястры» (Расія).
**12.05** Камедыйны дэтэктыў «Монк» (ЗША). 7-я і 8-я серыі.
**13.35** «Грандыёзная гонка». Рэаліці-шоў.
**14.20** Дак.-біяграфічны серыял «Вялікія спакусніцы кіно. Марыя Шнайдэр» (Францыя).
**15.15** Мультсерыял (Японія).
**16.00** Пазакласная гадзіна.
**16.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.25** Медычныя таямніцы з доктарам А.Цярэшчанкам.
**18.00** Серыял «Каханне як каханне» (Расія). 4-я серыя.
**19.00** Дак.-камедыйны серыял «Гісторыя жартуе» (ЗША-Канада). 4-я серыя.
**19.30** Беларускае «времечко».
**20.25** Калыханка.
**20.45** Экспедыцыя.
**20.50** Дэтэктыўны серыял «Аплачана смерцю» (Расія). Заключная серыя.
**21.40** Час футбола.
**22.10** Іншыя. Псіхалогія крыміналу.
**22.40** Крымінальная камедыя «Хованкі» (Расія).

### РОССИЯ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.15** «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**10.05** «Гуд бай, Амерыка. Кампазітар Зацэпін». Дакументальны фільм.
**11.00** Весткі.
**11.30** «Цыганачка з выхадам», Расія, 2009 г.
**13.10** «Гарадок». Дайджэст.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Лініі лёсу».
**15.10** Прэм'ера. «Адчайныя хатнія гаспадыні».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Гарадок». Дайджэст.
**17.55** «Тайга».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.30** Прэм'ера. «Кармеліта. Цыганскія жарсці». Тэлесерыял. Расія, 2008 г.
**20.30** «Цыганачка з выхадам». 2009 г.
**22.30** «Лініі лёсу».
**23.30** Навіны - Беларусь.
**23.40** «ВЕСТКІ+».
**00.00** Дакументальны фільм.

### НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.05** Серыял «Толькі ты...».
**08.55** «Кухары і кухцікі».
**09.25** «Іх норавы».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Змаганне за ўласнасць».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.20** Серыял «Ментоўскія войны».
**12.10** «Сярэдні клас».
**13.00** Сёння.
**13.35** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**15.10** Серыял «Аэрапорт-2».
**16.00** Сёння.
**16.30** Крымінальны серыял «Вуліцы пабітых ліхтароў».
**18.15** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**18.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.35** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.25** Серыял «Ментоўскія войны».
**23.15** Сёння.
**23.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**00.05** «Ты смешны!».

### EUROSPORT

**09.30** Гольф. Еўрапейскі тур. Адкрыты чэмпіянат KLM.
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Германія - Нарвегія. Тампере (Фінляндыя).
**11.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Украіна - Данія. Тампере (Фінляндыя).
**13.00** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Нідэрланды - Фінляндыя. Тампере (Фінляндыя).
**14.30** Веславанне. Чэмпіянат свету. Познань (Польшча). Дзень 1.
**16.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Нідэрланды - Фінляндыя. Тампере (Фінляндыя).
**17.30** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Францыя - Германія. Тампере (Фінляндыя).
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.45** Футбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Групавы этап. Ісландыя - Нарвегія. Тампере (Фінляндыя).
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Пра рэстлінг. Vintage Collection. ЗША.
**01.00** Пра рэстлінг. Агляд WWE (World Wrestling Entertainment).
**01.30** Армрэстлінг. PAL/NAL.
**02.00** Лодкавы спорт. Чэмпіянат свету. Клас Р1. (Швецыя).

### БЕЛСАТ tv BELSAT

**19.00** Аб'ектыў (агляд падзеяў дня).
**19.05** «Ранча Піковая Сямёрка», серыял.
**19.30** «Бульбаны», мультсерыял.
**19.40** «Лекар душы», рэпартаж, рэж. Мікалай Ваўранюк, 2008 г., Польшча.
**20.00** YoLife! (моладзевая праграма).
**20.20** На колах.
**20.50** Гісторыя пад знакам Пагоні: «Багі».
**21.00** Аб'ектыў (галоўнае выданне).
**21.20** «Рок назаўжды», дак. фільм, 2008 г., Беларусь, ч. 1.
**21.55** Форум (ток-шоў): «Куды пайсці вучыцца?»
**22.40** Аб'ектыў.

ВЫБАРЫ

# РЭВАЛЮЦЫЯ АДКЛАДАЕЦЦА ДА ВЯСНЫ



**Францыя — безумоўны лідэр у Еўропе па частцы сацыяльных пратэстаў. Куды можа прывесці хваля народнага незадавальнення? Якія тэндэнцыі на апазіцыйнай сцэне? Пра гэтыя і іншыя аспекты актуальнай сітуацыі ў Францыі журналіст «НЧ» Алег Новікаў размаўляе з французскім палітолагам Жан-Шарлем Алемандам.**




***— Наколькі моцна крызіс закрануў Францыю?***

— Хутчэй трэба казаць пра тое, якія сектары эканомікі ён закрануў больш, а якія менш. Перш за ўсё дасталося галіне машынабудавання. Тут мелі месца масавыя звальненні. Аднак колькасць беспрацоўных вырасла не так моцна, калі параўноўваць з ЗША або Вялікабрытаніяй. Галоўныя прычына ў тым, што дзяржаўны сектар у Францыі дастаткова вялікі. Тут з часоў сацыяльнай дзяржавы захавалася эфектыўная сістэма сацыяльнай абароны і пераразмеркавання прыбыткаў. Увогуле, цікава назіраць, як праяўляецца крызіс знешне. Напрыклад, вельмі незвычайна выглядае сёння Парыж, які традыцыйна жыве за кошт турыстаў. Зараз зеніт турыстычнага сезону, аднак кафэ і рэстараны пустыя. Няма чаргі ў Луўр. А вось сітуацыя на курортах Рыўеры абсалютна іншая. Аказалася, што ў параўнанні з мінулым годам прыбыткі ў гэтым сектары нават выраслі. Прычына вельмі незвычайная: уся сусветная эліта ў роспачы ад крызісу, таму вырашыла забыцца на курорце. Попыт на дарагія гатэлі нават вырас, а вось уладальнікі сціплых гатэляў, разлічаных на турыстаў сярэдняга класу, наадварот, адчуваюць праблемы.

***— Ці адлюстравалася рэцэсія на палітычнай сітуацыі, прынамсі на рэйтынгу папулярнасці Нікаля Сарказі?***

— На пачатку года мелі месца масавыя дэманстрацыі. На Першае мая выйшла ўвогуле рэкорднае колькасць маніфестантаў, больш за 4 мільёны. Акрамя таго, назіраўся рост колькасці спантанных акцый. Працоўныя акупавалі заводы, бралі патронаў у заложнікі, каб тыя не прадалі абсталяванне і г. д. Гэта б значыла паступовае закрыццё прадпрыемстваў. Часам тыя ініцыятывы нават не былі звязаныя з прафсаюзамі. Адбыліся вялікія дэманстрацыі студэнтаў і выкладчыкаў супраць скарачэння акадэмічнай аўтаноміі.

Што тычыцца палітыкі, то рэйтынг Сарказі і ўраду трошкі знізіўся. Выбары ў Еўрапарламент сталі своеасаблівым тэстам. Аказалася, што блок партый, які падтрымлівае ўрад, усё роўна набраў большасць, хаця і не шмат — 29 працэнтаў. Акрамя таго, вядучая апазіцыйная партыя — сацыялісты — папросту ўшчэнт прайграла (атрымала 16 працэнтаў). На гэтым фоне падняліся іншыя новыя левыя — Фронт левых, Зялёныя, Новая антыкапіталістычная партыя.

***— Дастаткова нечаканым стаў вялікі працэнт галасоў, якія былі аддадзеныя за Зялёных (15%). У чым сакрэт іх поспеху?***

— Перш за ўсё, гэтыя выбары паставілі антырэкорд па актыўнасці выбаршчыкаў. Галасавалі ўсяго прыкладна 40 працэнтаў. Дарэчы, гэта самы нізкі паказчык у гісторыі выбараў у краіне. А ў працоўных кварталах і таго менш — каля 30 працэнтаў. Таксама вельмі мала галасавалі людзі маладзей за 35 гадоў. 70 працэнтаў моладзі байкатавалі выбары. Аднак, з іншага боку, на выбары прыйшлі ўсе прыхільнікі ЕС, і яны, натуральна, галасавалі за партыі, якія найбольш радыкальна выступаюць за пашырэнне кампетэнцыі інстытутаў ЕС. Гэта перш за ўсё Зялёныя. Апошнія падчас кампаніі нават больш крытыкавалі Барозу, чым Саркаі. Нічога дзіўнага, што дзяржава дазволіла ім карыстацца грамадскімі каналамі. Перамога Зялёных садзейнічала росту экалагічнай свядомасці. Гэта пазітыўны момант. Тэма змянення клімату стала часткай палітычнай дыскусіі.

***— Якія працэсы назіраюцца ў шэрагах галоўнай апазіцыйнай Сацыялістычнай партыі?***

— Параза на еўрапейскіх выбарах спарадзіла ўнутраны крызіс у партыі. Сама апазіцыйная ідэя ў крызісе. Сацыялісты доўгі час думалі, нібыта ўсё ідзе да таго, што сітуацыя ў Францыі будзе такой, як у ЗША, дзе існуе па-сутнасці двухпартыйная сістэма. У такой схеме яны планавалі заняць нішу дэмакратаў. Аднак такі праэкт праваліўся. Па-першае, акрамя сацыялістаў існуюць іншыя левыя партыі, і знікаць яны не збіраюцца. Па-другое, у адрозненні ад амерыканскіх дэмакратаў, якія на час выбараў кансалідуюцца, французскія сацыялісты наадварот увесь час сварацца. Фактычна Сацпартыя расколатая на некалькі груповак. Галоўная лінія супрацьстаяння: група былога кандыдата Сігален Руаяль супраць клана Марціна Абры (старшыня партыі). Гэта вельмі негатыўна ўплывае на імідж і на выніку выбараў. Большага падарунка для Сарказі, чым разборкі паміж сацыялістамі, няма. Увесь час (як, дарэчы, і ваш прэзідэнт) наш гарант тыкае на апазіцыю і кажа: ну як яны могуць аб'яднаць нацыю, калі паміж сабой знайсці кампраміс не здольныя.

***— Яшчэ адзін нечаканы вынік чэрвеньскіх выбараў — адносна добры паказчык камуністаў. Пасля краху СССР давер да Кампартыі стабільна падаў. Ці значыць гэта, што французы зноў пачалі давяраць партыі «верных марксістаў-ленінцаў»?***

— Думаю, што падзенне папулярнасці камуністаў прыпынілася. Адносна добры вынік тлумачыцца кааліцыяй з Левай партыяй (адкол ад сацыялістаў). Шмат будзе залежыць ад дынамікі на левым флангу. Зараз акрамя Сацпартыі працуюць Фронт левых (блок камуністаў і Левай партыі) і трацкісты. Зялёныя адмаўляюцца ад сацыяльнай тэматыкі і ўсё часцей выконваюць функцыі партыі цэнтру. Пачынаецца вялікая гульня — хто будзе так званымі «левымі левымі». Думаю, што ў такіх умовамі камуністы самі зацікаўленыя ў тым, каб змяніць брэнд. Словы «камуністы» больш пасуе XX стагоддзю, а не XXI.

***— Калі партыі знаходзяцца ў стане «перазагрузкі», магчыма, ролю авангарда апазіцыі здольныя выканаць прафсаюзы?***

— Цяжка казаць. Прафсаюзы вельмі расколатыя. Апошнім часам яны пераварыліся з-за пытання, ці могуць супермаркеты і крамы працаваць у нядзелю. Традыцыйна прафсаюзы былі супраць такой практыкі, лічачы, што на тое і выходныя, каб усе працоўныя адпачывалі. Апошнім часам некаторыя прафцэнтры пачалі выступаць за тое, каб усё ж дазволіць працу крамаў у нядзелю, натуральна, пры ўмове, што персанал на гэта пагодзіцца і атрымае большы заробак. Крытыкі кажуць, што ў час крызісу вельмі лёгка прымусіць працаваць «дабраахвотна» пад пагрозай звальнення. Гэта тэма выклікае столькі эмоцый, што часам сам крызіс і сацыяльная альтэрнатыва мадэлі Сарказі сыходзяць на задні план. Акрамя таго, мы, французы, так любім дэмакратыю, што жывём электаральнымі цыкламі. Цяпер галоўная інтрыга — не перспектывы рэвалюцыі, а вынікі рэгіянальных выбараў наступнай вясною. Думаю, да гэтага часу нічога глабальнага не адбудзецца.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Беларускі палітычны рэжым дэманструе дзіўную ўстойлівасць як унутры краіны, так і за яе межамі. Не сакрэт, што адсутнасць досведу дзяржаўнага будаўніцтва вельмі моцна падрывала знешнюю палітыку дзяржаў, якія ўтварыліся пасля развалу СССР. За рэдкім выключэннем, у новых лідэраў не было досведу вядзення палітыкі ў міжнародным маштабе. І прэзідэнт Лукашэнка не з'яўляўся тут выключэннем. Але ён аказаўся чалавекам, здольным вучыцца на памылках. У апошнія гады Лукашэнка не робіць памылковых крокаў. Калі градус рэпрэсіўнай палітыкі ўнутры Беларусі не павялічыцца, захаваецца рыторыка адносна роўнай важнасці як заходняга, так і ўсходняга кірунку ў знешняй палітыцы, а сам Лукашэнка будзе дыстанцавацца ад адыёзных крокаў Расіі, гэтага будзе цалкам дастаткова, каб прывесці да істотнага пацяплення беларуска-амерыканскіх адносін.

**«Deutche Welle» (Германія)**

Характэрна, што афіцыйнае інфармацыйнае агенцтва БЕЛТА вельмі скупа паведаміла пра гэтыя сустрэчы (сустрэча прадстаўнікоў адміністрацыі Лукашэнкі і прадстаўніка адміністрацыі ЗША Філіпа Гордана): сухое паведамленне можа азначаць, што перамовы прайшлі не надта гладка. Напрыклад, чэрвеньскі візіт у Мінск дэлегацыі кангрэсменаў ЗША афіцыйныя СМІ асвятлялі ў дэталях, а саміх кангрэсменаў прыняў прэзідэнт, які паабяцаў ЗША беспершкодны доступ да беларускіх актываў у абмен на адмену Акту пра абарону дэмакратыі ў Беларусі. Гордана спадар Лукашэнка не прымаў. Кіраўніцтва Беларусі атрымала і яшчэ адзін непрыемны сігнал. Амбасада ЗША паведаміла, што спадар Гордан правёў кансультацыі з амбасадарамі краін ЕС у Мінску «пра агульную пазіцыю ў стаўленні да Беларусі». Гэта можа азначаць, што Вашынгтон мае намер дамагацца адзінага падыходу Захаду да адносін з Беларуссю, улады якой у апошні час заяўлялі ледзь не пра новую эру ўзаемадзеяння з ЗША і ЕС.

**«Коммерсант» (Расія)**

«Мінск, на фоне малочнай вайны з Масквой, у апошнія месяцы таксама дыстанцуецца ад АДКБ. Пры гэтым Беларусь, як і Узбекістан, адмовілася падпісваць дамову пра фармаванне Калектыўных сіл хуткага рэагавання. Зрэшты, фронда ўзбекскага і беларускага прэзідэнтаў не перашкодзіла Расіі дамагчыся ад іншых краін згоды на стварэнне КСХР. Гэта гісторыя стала вельмі паказальным прыкладам таго, як насамрэч працуе механізм прыняцця рашэнняў у АДКБ. Яны павінны прымацца кансенсусам. Але калі штосьці трэба Маскве, то, нягледзячы на пратэсты нязгодных, рашэнне ў АДКБ будзе прынятае ў парушэнне працэдур. Відавочна, што гэта таксама не можа не насцярожваць амбіцыйных лідэраў Беларусі, Узбекістана, Казахстана, якія не жадаюць, каб іх краіны былі нямымі статыстамі ў «вялікай гульні», якую вядзе Расія.

**«Дзеркало Тижня» (Украіна)**

Іспрва тут не толькі ў незадаволенасці прэзідэнта ўласнымі сілавікамі. Цяпер краіна перажывае самы сур'ёзны крызіс з часоў 1990-х, і ў гэтай сувязі словы прэзідэнта пра тое, што неўзабаве Беларусь будзе жыць на «ўзроўні ЕС», выглядаюць неправканаўча. Рэйтынгі Бацькі валяцца нават у рэгіёнах. Разам з тым, відавочна, ёсць незадаволеныя прэзідэнтам і сярод яго паплечнікаў. Пра гэта, прынамсі ў Мінску, гуляе шмат чутак. У гэтай сувязі рашэнне стварыць асобную арганізацыю, якая б разбіралася з усімі больш-менш значнымі палітычнымі постацямі і сілавікамі і пры гэтым была падкантрольнай асабіста прэзідэнту, выглядае цалкам лагічна. У прынцыпе, пра беларускага прэзідэнта заўсёды казалі, быццам ён не давярае нават самаму блізкаму асяроддзю.

**«Частный кореспондент» (Расія)**

Беларусь і Літва відавочна апынуліся закладнікамі ўнутрырасійскай барацьбы за малочны рынак. І ўжо зрабілі высновы з таго, што пэўныя бізнесовыя колы ў Расіі ў стане для абароны сваіх эканамічных інтарэсаў дамагчыся ад улад краіны практычна любых эканамічных мер.

**«Росбалт» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### УКРАІНА. ГАЛОЎНЫ БАНДЭРАВЕЦ РАСІІ ПРОСІЦЬ ПРЫТУЛАК



Пётр Хамякоў, расійскі вучоны і сябра гуртка «Рускія за УПА» (УПА — Украінская паўстанцкай армія) папрасіў палітычны прытулак ва Украіне. Адначасова ён звярнуўся да прэзідэнта Ючшанкі з адкрытым лістом, у якім гаворыцца, што на сваёй радзіме вучоны стаў ахвярай палітычнага пераследу. Па словах аўтара ліста, на яго намагаюцца «павесіць» артыкул «Стварэнне экстрэмісцкай арганізацыі». Акрамя таго, на думку Хамякова, яму не могуць прабачыць серыю выступаў у прэсе наконт унутранага стану расійскага рэжыму. Хамякоў сцвярджае, што ў Расіі сістэмны крызіс, краіна на парозе краху і г.д. Здавалася, Ючшанка, які вядомы як вялікі прыхільнік УПА, павінен як мага хутчэй даць Хамякову палітычны прытулак. Аднак афіцыйны Кіеў пакуль маўчыць. Прычына, думаецца, у тым, што Хамякоў мае вельмі супярэчлівае рэнаме. Ён не толькі крытык Пуціна і прыхільнік Бандэры, аднак і заўзяты паганец з яўна выражанымі расісцкімі поглядамі. Так, ён з'яўляецца аўтарам твораў, назвы якіх гавораць самі за сябе: «Отчет Русским Богам ветерана Русского Движения». «Кто «заказал и оплатил» Батыево нашествие» і г.д. Наштo Ючшанку звязвацца з падобнымі персанажамі?

**Па матэрыялах украінскай прэсы**

### ФРАНЦЫЯ. ПАЛЯЎНІЧЫЯ І РЫБАЛОВЫ ЗА САРКАЗІ




Філіп дэ Віль, старшыня французскай партыі «Паляванне, рыбалка, прырода, традыцыі» (CPNT) заявіў, што паляўнічыя і рыбаловы могуць уступіць у склад Саюза за народны рух (UMP) — партыі прэзідэнта Нікаля Сарказі. Такая ініцыятыва пакуль не выклікала пратэстаў сярод шараговых партыйцаў, хаця звычайна CPNT намагаецца трымаць дыстанцыю як ад левых, так і ад правых, да лагеру якіх належыць UMP. Як кажуць самі функцыянеры, такі крок абсалютна лагічны з пункту гледжання тэндэнцый на французскай палітычнай сцэне. Грамадства не хоча галасаваць за палітыкаў, якія займаюцца асобнымі пытаннямі і не маюць глабальнага погляду. Напрыклад, у 1998 годзе CPNT меў каля 30 мясцовых дэпутатаў, зараз — ніводнага. У такой сітуацыі паляўнічыя і рыбаловы былі вымушаныя выбіраць паміж сацыялістамі і галістамі. Выбар быў зроблены на карысць галістаў. Праўда, без бонуса за такі крок CPNT наўрад ці застанецца. Нікаля Сарказі ўжо паабяцаў стварыць міністэрства прыроды (не блытаць з міністэрствам экалогіі). Цалкам магчыма, што ў выніку ўваходу CPNT у партыю Сарказі гэта міністэрства ўзначаліць які-небудзь былы паляўнічы ці рыбалоў.

**Па матэрыялах «Le Figaro» (Францыя)**




### АЗЕРБАЙДЖАН. ТЭСТ НА ЛЮБОЎ ДА РАДЗІМЫ

Раўшан Насірлі, грамадзянін Азербайджана, прыйшоў на азербайджанскую секцыю «Радыё Свабода» і распавёў пра абсалютна вар'яцкі выпадак, які з ім здарыўся. Яго запрасілі ў Міністэрства нацыянальнай бяспекі і прымусілі ў пісьмовай форме растлумачыць, чаму на конкурсе «Еўрабачанне» ён прагаласаваў за армянскага выканаўца. Галасаванне, хто не ведае, на гэтым конкурсе праводзіцца праз SMS. Пры гэтым, як сцвярджае Раўшан, агенты спецслужб аказвалі на яго псіхалагічны ціск. Па словах чэкістаў, галасаванне на «Еўрабачанні» — гэта пытанне нацыянальнай бяспекі. Усяго ў Азербайджане за армянскіх музыкаў, калі верыць статыстыцы «Еўрабачання», галасавала 43 чалавекі. Думаецца, усіх напаткаў той жа лёс, што і Раўшана.

**Па матэрыялах «Панарамы» (Арменія)**

КІНО

# ДРУГАЯ СУСВЕТНАЯ ПА-ПОСТМАДЭРНІСЦКУ

Іван БІЧ



**Прэм'ера мінулага тыдня — стужка «Ганебныя вырадкі» славутага амерыканскага рэжысёра Квенціна Таранціна.**

Крытыкі адзначылі, што Таранціна вельмі творча падкрэсліў абсалютную антыгістарычнасць свайго твору. Фільм пачынаецца словамі: «Аднойчы ў акупаванай Францыі». Гэта нагадвае пачатак сагі «Зорныя войны»: «Калісьці даўно ў далёкай галактыцы».

Сюжэт фільма — фактычна альтэрнатыўная версія другой сусветнай вайны. У стужцы распавядаецца пра агентаў антыгітлераўскай кааліцыі, якія дзейнічаюць на тэрыторыі акупаванай нацыстамі Францыі і плануюць забойства Гітлера. Гэта амерыканцы яўрэйскага паходжання, якія наводзяць жах на фашысцкіх захопнікаў. Там, дзе яны праходзяць, застаюцца выключна мёртвыя фашысты, прычым без скальпаў. Часам, праўда, у амерыканскіх спецназаўцаў праяўляецца гуманізм. Тады яны папросту выразаюць нажом на лбе ворага свастыку. Каб пасля вайны было зразумела, што ён быў фашыстам, — тлумачаць янкі.

Перад тым, як быць закінутымі ў тыл праціўніка, камандзір групы Альда Райн (Брэд Піт) патрабуе, каб кожны сябра групы пакляўся дабыць сто скальпаў праціўніка. Байцы ахвотна выконваюць дадзенае камандзіру слова, і ў выніку наводзяць такі жах на немцаў, што чуткі пра іх выхадкі даходзяць да Гітлера. Фюрэр дае загад вопытнаму разведчыку Гансу Ланда знішчыць амерыканцаў.

Між тым, Джаана Дрэйфус — яўрэйская дзяўчына, усю сям'ю якой забілі нацысты і якая працуе ў адным з кінатэатраў, даведваецца, што менавіта тут рыхтуецца суперпрэм'ера. Будзе дэманстравацца фільм «Гонар нацыі» пра снайпера, які забіў на Усходнім фронце 300 чырвонаармейцаў. Чакаецца ўся эліта Трэцяга рэйху. Дрэйфус задумала падпаліць тэатр падчас імпрэзы. Яна не ведае, што Чэрчыль даў падобны загад «ганебным вырадкам». А тыя, у сваю чаргу, не здагадваюцца, што ў іх атачэнні ёсць падвойны агент, які працуе на гестапа. Адным словам, інтрыга і гвалт гарантаваныя.

Аднак гвалт і інтрыга — гэта яшчэ не ўсё. Таранціна шмат увагі прысвяціў дыялогам. Менавіта дыялогі былі ахілесавай пятой яго папярэдніх карцін — «Джэкі Браўн» і «Забіць Біла». Яны не падарвалі яго культавы статус лепшага рэжысёра постмадэрнізму, аднак і вялікага шуму не нарабілі. На гэты раз Таранціна добра прапісаў дыялогі.

Каб прыдумаць не вельмі мудрагелістую гісторыю, Таранціна спатрэбілася 10 гадоў. Як кажа ён сам, гэта павінен быў быць самы лепшы сцэнар, які ён напісаў у сваім жыцці. Сам сінопсіс у прынцыпе быў гатовы ў 2002-м, аднак рэжысёр вырашыў пачакаць і яшчэ раз усё прадумаць, асабліва фінал. Ён нават убіў сабе ў галаву, што фільм будзе эпічным творам, і таму лепш за ўсё яго зрабіць да якога-небудзь значнага юбілею, звязанага з другой сусветнай вайной.

Сам Таранціна даўно падкрэсліваў, што марыць зняць вестэрн, падзеі якога адбываюцца не на Дзікім Захадзе, а ў Еўропе падчас другой сусветнай вайны. За аснову быў узяты аднайменны фільм італьянскага рэжысёра Энца Кастэлары, які выйшаў роўна 30 гадоў таму. Аднак назваць таранцінаўскіх «Ганебных вырадкаў» рымейкам фільма Кастэлары нельга. Квенцін перапісаў амаль увесь сцэнар, пакінуўшы выключна агульную ідэю пра амерыканскіх салдат у тыле фашыстаў.

Тыя, хто ўжо бачыў фільм, успрынялі яго вельмі супярэчліва. Так, аўдыторыя на міжнародным фестывалі ў Канах, дзе адбылася прэм'ера, сустрэла фільм 15-хвілінными авацыямі, прычым стоячы. Затое сайт «Гнілыя памідоры», які абірае самыя дрэнныя фільмы года, паставіў яму «высокую» адзнаку — 79 працэнтаў. «Variety» — адзін з самых аўтарытэтных часопісаў у Галівудзе — раскрытыкаваў «Ганебных вырадкаў» за тое, што глядач не цалкам ангажаваны ў карціну. Ён глядзіць на экран як назіральнік, асабліва не спачуваючы героям.



Французская кінакрытыка дала фільму добрую адзнаку і нават параіла амерыканскім акадэмікам выставіць яго на «Оскар».

Брытанская прэса палічыла, што фільм татальным чынам пазбаўленым густу і іроніі. «Guardian» нават не ўключыла прадукт Таранціна ў спіс 20-ці навінак кіно, якія трэба паглядзець на працягу лета. З іншага боку, усе брытанскія газеты адзначылі гульню Майкла Маерса. У «Ганебных вырадках» ён увасабляў брытанскага афіцэра, і зрабіў гэта, калі верыць знаўцам, цудоўна.

Як не дзіўна, у Германіі палеміка разгарнулася не вакол мастацкіх якасцяў стужкі, а з-за свастыкі, якая размешчана на арыгінальным плакаце. У выніку свастыку прыбралі.

Таксама цікава чытаць рэцэнзіі і расійскіх кінакрытыкаў: «Толькі Таранціна можа прымусіць людзей смяяцца з забойстваў і рассячэнняў. Здольны даць другое жыццё штампам. Ён сапраўдны канцэптуаліст, постмадэрніст, які не цытуе і пераймае, а прапрацоўвае пачатковы матэрыял. І нават калі ў выпадку з сусветнай гісторыяй, дзе адны факты і загадзя вядомыя даты і абставіны смерці, гледачы знаходзяцца ў сапіенсе («сапіенс» — модная ў кінематаграфічных колах слова, што ў англійскай перакладаецца як «напружанасць»), стане трывожнага чакання», — піша адзін з журналістаў.

Іншы кінакрытык напісаў яшчэ прасцей: «Вельмі моташна, аднак геніяльна».

Увогуле, канчатковы вердыкт гледачоў і крытыкаў па «Ганебных вырадках» яшчэ не сказаны. Аднак сам аўтар не сумняваецца ў поспеху. У эйфарыі самазадавальнення Таранціна ўжо заявіў, што цяпер менавіта яму павінны даць здымаць наступнага Бонда.

СКАНДАЛ

# АНТЫСЕМІЦКІ ПАДТЭКСТ

**Інцыдэнт, які адбыўся 6 жніўня ў цэнтры Ужгараду (Закарпацкая вобласць), здавалася, ніяк не цягне на падзею агульнанацыянальнага, а тым больш міжнароднага маштабу.**



У цэнтры горада некалькі маладых людзей, якія працавалі на Фронт зменаў (партыя Арсенія Яцэнюка — кандыдата на пасаду прэзідэнта), ставілі агітацыйны намёт.

Да групы пад'ехаў 41-гадовы мэр Сяргей Ратушняк. Некаторыя кажуць, што ён быў пад мухай. Так ці інакш, палатку Фронту зменаў ён зламаў, спаслаўшыся на тое, што яна не пасуе архітэктурнаму пейзажу. Пры гэтым ён «ужыў фізічную сілу» супраць адной з прысутных дзяўчын. Пазней яе даставілі ў шпіталь. Здавалася б, тыповая хуліганка.

Тым больш Сяргей Ратушняк пачынаў сваю кар'еру як крымінальны аўтарытэт па мянушцы Рата. У 1988 годзе ён арганізаваў у горадзе сіндыкат, які аб'ядноўваў 52 прадпрыемствы, уключаючы банк, страхавую кампанію і нават гарэлачны завод. У 1998-м яго абвінавацілі ў кантрабандзе валюты і пазней арыштавалі. Аднак гэта ўсё не перашкодзіла яму хутка стаць дэпутатам Вярхоўнай Рады ад блока «Наша Украіна» Віктара Юшчанкі. У 2006-м ён стаў мэрам Ужгарада. Лічыцца, што сувязі з адміністрацыяй прэзідэнта дазвалялі яму трактаваць законы на свой капыл. Так, некалькі чалавек скардзіліся на тое, што былі збітыя асабіста мэрам, аднак у Кіеве ходу судовым працэсам над Ратушняком не далі.

Але вернемся да інцыдэнту 6 жніўня. У той жа дзень мэр растлумачыў журналістам: «Пакуль ва Украіне існуе закон, яўрэй Яцэнюк і яго крымінальныя элементы павінны з ім лічыцца... Я б яшчэ зразумеў, каб яна (дзяўчына) так апантана білася за маці або бацьку. Но за жыда, прабачце. Мне сорамна за нашу моладзь».

Ратушняк дадаў, што дзяўчына, якую ён нібыта збіў, танцуе недзе стрыптыз. Акрамя таго, яна спрабавала яго задушыць. Аднак самымі шакіруючымі сталі словы Ратушняка наконт таго, што «Яцэнюк — зарваўшыся яўрэй, жыда-масон, якому патрэбна балатавацца ў сельсавет Ізраілю на грошы хасідаў».

Прайшло некалькі дзён, і нечакана 12 жніўня збітая дзяўчынка падала на мэра ў суд за фізічны гвалт, а Фронт зменаў — за расавую дыскрымінацыю. Супраць ужгарадскага мэра былі распачатыя адразу дзве крымінальных справы. Пазней яшчэ адна — за злоўжыванне ўладнымі паўнамоцтвамі.

Вось тут і пачаўся скандал. Прычым на гэты раз ён не абмежаваўся старонкамі газет. Украінскія інтэрнэт-форумы стракацяць каментарамі ў падтрымку Ратушняка, які «сказаў усю праўду», «паўстаў супраць дыктатуры ліберастаў», якога «яўрэйская мафія збіраецца зацягаць па судах».

Арсеній Яцэнюк — былы спікер Рады, дырэктар МЗС, у адказ публічна заявіў, што не мае яўрэйскіх каранёў, што ён на сто працэнтаў шчыры украінец. Гэта выклікала негатыўную рэакцыю сярод яўрэйскай грамады. «Чалавек, які прэтэндуе на ролю агульнанацыянальнага лідэра, не павінен бегаць за метрыкай і апраўдвацца», — заявіў прэзідэнт яўрэйскай грамады Украіны.

Хамскія заявы Ратушняка выклікалі гнеўную рэакцыю за мяжой. Так, адпаведную рэзалюцыю прынялі некалькі грамадскіх арганізацый Ізраілю. Імідж Украіны апынуўся пад пагрозай. У выніку ў сітуацыю давялося ўмяшацца прэзідэнту. Віктар Юшчанка даручыў сілавым ведамствам апаратыўна разабрацца ў справе.

На мінулым тыдні ў прэсе з'явіўся адкрыты ліст Ратушняка да ўкраінскага народа. Яго аўтар сцвярджае, што жыдамасоны на сваім сходзе пастанавілі забіць яго. Тэкст паслання не ўпісваецца ні ў якія рамкі палітычнай карэктнасці. «Я не супраць яўрэйства, — піша Ратушняк. — Я простых яўрэяў хачу ўберагчы ад пагромаў, якія абавязкова будуць пасля таго, што зараз палова краіны галоднай ідзе спаць. Я жадаю выратаваць простых яўрэяў ад той жыда-масонскай пасткі, якая стварылася пры Леанідзе Кучме, а пры Віктары Юшчанку памножыла свой капітал».

Між тым, палітолагі спрабуюць зразумець, што адбываецца. Пералічым асноўныя версіі.

- Справа Ратушняка — фатальная памылка каманды Яцэнюка. Варта згадаць, што сам Ратушняк у прынцыпе абыякава ставіўся да прэзідэнцкіх амбіцый Яцэнюка. Як прыклад — закарпацкая прэса, якую кантралюе мэр Ужгараду, ахвотна прадавала палосы пад палітычную рэкламу Фронту зменаў. Цалкам магчыма, што піяршчыкі Яцэнюка хацелі падняць рэйтынг боса, абвясціўшы вайну былому аўтарытэту, цяперашняму феадалу Закарпацця. Яцэнюк пачаў эксплуатаваць тэму бойкі з-за намёта, аднак пралічыўся. Ніхто не думаў, што Ратушняк пусціць у ход махровы антысемітызм.
- Мы маем справу з цудоўна прадуманым сцэнарам, мэтай якога была дыскрэдытацыя Фронту зменаў. Не выключана, што нехта ў адміністрацыі прэзідэнта, дзе не ў захапленні ад ніядрэннага старту Арсенія як самастойнага палітыка (ён займае трэцяе месца сярод кандыдатаў), замовіў Ратушняку антысеміцкія эскапады. Цяпер да Яцэнюка абавязкова прыліпне клішэ «жыда-масон». Для шматлікіх абывацеляў гэта дастатковая інфармацыя, каб галасаваць супраць. Сам праект «Яцэнюк» ператвараецца ў тупую перапалку наконт таго, хто жыда-масон, а хто — не.
- Тое, што мы назіраем, — лагічны ход падзей, следства адміністратыўнага хаосу і крызісу старых — у тым ліку «аранжавай» і «бела-блакітнай» — канцэпцый. Грамадства замаўляе новы палітычны мэйнстрым. Той пакуль мае рэгіянальны характар і выкарыстоўвае мясцовыя тэмы і забабоны (антысемітызм вельмі папулярны на Захадзе Украіны).

Пагроза ў тым, што, як паказаў выпадак з Ратушняком, антысеміцкая тэма мае вялікі патэнцыял, і ёсць верагоднасць, што будзе так ці інакш выкарыстана ўсімі. Як прыклад: фактычна ніводны з вядучых палітыкаў Украіны, нават камуністы, не падтрымаў Яцэнюка. За выключэннем Януковіча, які публічна асудзіў Ратушняка.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ




### АНГЕЛА МЕРКЕЛЬ

Канцлер Германіі і яе напарнікі праявілі сябе дастаткова творчымі людзьмі ў барацьбе за галасы сексуальных меншасцяў. Арэнай гэтай барацьбы стала берлінская выбарчыя акруга Фрыдрыхсхайн-Кройцберг. Тут шмат моладзі, студэнтаў, музыкаў, іншаземцаў і прадстаўнікоў сексуальных меншасцяў. Звычайна апошнія галасуюць за Зялёных. Тыя ў гэтым годзе вырашылі падкрэсліць свае сімпатыі да сексменшасцяў і размясцілі на вуліцах раёну плакаты, на якіх рукі белай жанчыны ляжаць на філейных частках чарнаскурай жанчыны. Подпіс: «Ёсць толькі адна падстава, каб абіраць чорнае» (чорны — партыйны колер Хрысціянска-дэмакратычнай партыі — CDU). Аднак CDU знайшла варты адказ: развесіла свае плакаты, на якіх адлюстраваныя кандыдат ад CDU Вера Ленгсфельд і канцлер Ангела Меркель у вечаровых сукенках з глыбокім дэкальтэ. Подпіс казаў сам за сябе: «Мы можам прапанаваць нашмат больш». Прапаганда мела эфект. Зялёныя абурыліся і заявілі, што «класічныя вечаровыя сукенкі — атрыбут часоў, калі жанчын за людзей не лічылі».



### НАВРУЗАЛІ МАМЕДАЎ

Прафесар этнаграфіі, адзін з лідэраў руху талышоў (народу на поўдні Азербайджана) памёр у шпіталі адной з турмаў краіны, дзе адбываў пакаранне як іранскі шпіён. Яго арыштавалі ў 2007 годзе і абвінавацілі ў тым, што ён друкуе газету за грошы іранскага ўраду (дарэчы, Махмуд Ахмадзінеджад — таксама этнічны талыш). Паступова абвінавачанне перарасло ў артыкул «шпіянаж». У мінулым годзе Мамедава асудзілі на 10 гадоў. Да шпіёнскай дзейнасці аднеслі яго лісты на азербайджанскае ТБ з патрабаваннем пачаць трансляцыі на талышскай мове і скаргі ў міжнародныя інстытуты на дрэнны стан правоў талышоў. Цікава, што ў асяроддзі талышскіх актывістаў Мамедаў лічыўся апартуністам, і нават «чалавекам дзяржавы». Так, ён адмовіўся ад кантактаў з Ерэванам, які спрабаваў фінансаваць сепаратысцкі рух талышоў. «Мы — грамадзяне Азербайджану і служым азербайджанскай дзяржаве», — заявіў прафесар. Радыкалы ў сваю чаргу абвінавацілі яго ў тым, што ў сваім «Слоўніку талышскай мовы» вучоны падкрэсліваe яе сувязь з мовамі цюркскіх народаў. Гэта дае падставы сцвярджаць, што справа была сфабрыкавана спецслужбамі ў рамках прафілактычнай работы з барацьбітамі за правы малых этнасаў Азербайджану. Да падобнай версіі схіляліся і праваабаронцы. Міжнародная Амністыя абвясціла Мамедава вязнем сумлення. Раскрытыкаваў вердыкт суда і еўракамісар. Аднак Баку просьбы вызваліць Мамедава праігнараваў, што ў выніку прывяло да смерці талышскага патрыёта. Застаецца дадаць, што ў Азербайджане 65 палітычных вязняў.

### МАРЫАНА РАХОЙ



Старшыня іспанскай кансерватыўнай Народнай партыі (PP), якая знаходзіцца ў апазіцыі, выршыў скарыстацца правaламі ўраду ў барацьбе з тэрарызмам. Мова пра некалькі выбухаў на іспанскіх курортах, якія арганізавала баскская нацыяналістычная арганізацыя ETA. Рахой і кампанія заявілі пра выхад з так званага Пакту супраць тэрору, прынятага ўвосень мінулага года. Леташняя дамова, якую падпісалі вядучыя палітычныя сілы краіны, прадугледжвала сумесную палітыку адносна баскскага пытання. Цікава, што слабую эфектыўнасць барацьбы супраць тэрарыстаў кансерватары звязалі з шэрагам апошніх карупцыйных скандалаў, фігурантамі якіх былі сябры Народнай партыі. Па словах аднаго з яе функцыянераў, МУС замест таго, каб змагацца з тэрарыстамі, праследуе апаратчыкаў PP, у прыватнасці ўдзень і ўначы праслухоўвае іх тэлефоны ў пошуках новых доказаў. Дэмарш кіраўніцтва PP, аднак, можа мець негатыўныя наступствы. Зараз уся краіна чакае першага працэсу над адным з падазраваных па згаданай справе. Калі пракуратура давядзе, што падазраваныя сапраўды скралі з бюджэту некалькі дзесяткаў мільёнаў еўра, спробы PP адцягнуць увагу ад скандалу за кошт тэрактаў ETA могуць ёй дорага каштаваць.

СПАДЧЫНА

# ГРАМАДСКІ ЦУД У ЛЮБЧЫ

Марыя МАРТЫСЕВІЧ

**Добрая навіна для ўсіх аматараў прыўкраснага: у Беларусі з'явіўся другі — пасля вежы касцёлу брыгітак у Гродна — прыклад стылю зграфіта. Карніз, выкананы ў складанай рэнесанснай тэхніцы, калі на будынак наносіцца некалькі слаёў тынкоўкі, па якіх уручную прадрапваецца малюнак, упрыгожыў толькі-толькі адноўленую Вуглавую вежу замку ў Любчы.**


Іван Пячынскі

Такі сама малюнак быў на брамнай вежы, што захавалася да нашых дзён, сцвярджае, абапіраючыся на лабараторныя доследы, дырэктар фонду «Любчанскі замак» Іван Пячынскі. Але зграфіта — толькі прыватны выпадак «любчанскага цуду»: каб нанесці малюнак на карніз вежы, трэба было падняць яе ад самага падмурку з друзу. На гэта пайшло 5 год і каля 200 мільёнаў рублёў. З 6 ліпеня па 30 жніўня ў Любчы ладзяцца міні-летнікі для валанцёраў. Па сутнасці, гэта амаль фінішная прамая першага этапу рэстаўрацыі. На верасень запланавана зняцце рыштаванняў з вежы, якая да таго часу ўжо набудзе свой гістарычны колер — кавы з малаком.

## Звычайны чалавек

«Каб ты ўсё жыццё камяні на замак вазіў!» — за савецкім часам экскурсаводы цытавалі гэты традыцыйны беларускі праклён, падводзячы турыстаў да Мірскага, Лідскага, Крэўскага ці Навагрудскага замкаў. Беларускае дойлідства з каменю, а не з пясчаніку ці туфу, у гэтым яго адрозненне ад замкаў і храмаў Заходняй Еўропы. Плінфу і, пазней, цэглу-пальчатку перамяжоўвалі валуны, якіх багата пакінуў у Беларусі ледавік, што апаўзаў са Скандынавіі. Беларускія сяляне калісьці мелі паншчыну — падвозіць да замку каменне, знойдзенае на палях. Праца лічылася вельмі цяжкай, і просты чалавек сэнсу ў ёй не бачыў, казалі экскурсаводы. За савецкім часам гэты расповед вы-



крываў прыгнятальніцкі характар панскай улады, а таксама падкрэсліваў непасрэдны ўдзел народу ў стварэнні шэдэўраў архітэктуры. І, дадумвалася за экскурсаводаў, народ кінуўся разбіраць замкі, вяртаючы прыцягнутыя ім валуны, як толькі стала «можна».

Вазіць камяні на замак — адна канструктыўная мадэль светабудовы. Разбіраць замкі на кароўнікі ці вясковыя клубы — другая, як мне здаецца, усё-ткі дэструктыўная. Тое, што Беларусь вось ужо некалькі стагоддзяў жыве па другой мадэлі — агульнавядомая сумная ісціна. Зямля пад нашымі нагамі круціцца не ў той бок, і яшчэ дзесятак год таму раскруціць яе ў правільны здавалася заданнем для супермэна. Але вось раптам з'явілася нагода пагаварыць пра звычайнага чалавека, якому, каб перавярнуць зямлю, патрэбная ўсяго толькі кропка апоры.

У любчанскай гісторыі такім «звычайным чалавекам» стаў Іван Пячынскі, прадпрымальнік, палкоўнік войску СПА ў адстаўцы. А кропкай апоры — Любчанская сярэдняя школа, што стаіць у наш час пасярод замкавага дзядзінца, на стромым беразе Нёмана. Школьнікам, збягаючы на перапынках купацца ў рацэ ці гойсаючы на санках з замкавых валоў, Пячынскі аглядаў парэшткі замка, прыкідваючы, ці магла б яна стаяць зноў. І ўжо ў сталым веку (пасля хваробы, што паставіла пад пагрозу яго жыццё) сказаў сабе, што адрэстаўруе замак.

## Каб не сыпалася

У дзяржаўных планах па рэстаўрацыі архітэктурнай спадчыны чатыры замкі: Мірскі, Нясвіжскі, Косаўскі і Ружанскі. Разраджацца традыцыйнай ужо ў культурніцкіх СМІ занепакоенасцю наконт рэстаўрацыі першых двух аб'ектаў з гэтага спісу я не буду, бо не яны — тэма гэтага нарыса. Яго тэма — праекты рэстаўрацыі, ініцыятыва якіх ідзе знізу, ад звычайных грамадзян. І якія, дзякуючы гэтай сваёй ініцыятыве, робяцца ў вачах як чыноўнікаў, так і мясцовых жыхароў, блазнамі. Але, як паказвае практыка, адсутнасць сродкаў і любоў да роднай зямлі і яе гісторыі ператварае грамадскіх рэстаўратараў у эканомных, руплівых гаспадароў, якія прытрымліваюцца падчас аднаўлення архітэктурных помнікаў самых высокіх еўрапейскіх стандартаў.

У Беларусі вядома ўсяго пара грамадскіх праектаў захавання разбуранай спадчыны. Сядзіба Агінскіх Залессе і залескі парк — «Паўночныя Афіны», як называлі яго ў XVIII стагоддзі, — стаіць толькі дзякуючы руплівасці мясцовых краязнаўцаў, якія, не чакаючы працягу варварскай дзяржаўнай рэстаўрацыі, яшчэ ў 1990-я пачалі ажыццяўляць уласны праект, зрабіўшы па дарозе некалькі сенсацыйных адкрыццяў што да выгляду парку і маёнтка. «Мы пакрысе робім, а калі ў дзяржавы дойдуць рукі, можа яна не стане нічога разбураць?» — асцярожна спадзяюцца ў Залессі.

Як і ў выпадку з Залессем, у Івана Пячынскага нічога не атрымалася б без падтрымкі землякоў. Найперш — роднага брата Генадзя, любчанскага ляснічага. Простыя жыхары Любчы ставіцца да адбудовы замка зычліва, але памяркоўна. Значна большую цікавасць праяўляе рамантычна настроенае студэнцтва. Працоўная сіла, што цягам 7 год вяртала камяні на іх месцы, — валанцёры з усіх канцоў Беларусі і з-за яе межаў. Пячынскі вядзе дбайны ўлік усіх, хто ачысціў сабе карму, папрацаваўшы на рэстаўрацыі хаця б адзін дзень. За пяць год вакол рэстаўрацыі згрупавалася кола падтрымкі, якое налічвае каля 1000 чалавек. Адна з самых актыўных моладзевых арганізацый, што спрычынілася да аднаўлення Любчы, — БАСА (Беларуская асацыяцыя студэнтаў-архітэктараў).

«Сярод нашых валанцёраў ёсць заўсёднікі, склалася добрая кампанія, — кажа Пячынскі. — У нас тут добра. Днём моладзь працуе, увечары — адпачывае, гуляе, само сабой, кахаецца («любіцца») — радуецца жыццю. Тыя, хто прыязджаў сюды студэнтамі, вяртаюцца ўжо сем'ямі, з маленькімі дзецьмі». Нават калі няма валанцёрскіх летнікаў, будаўнікі прыязджаюць з Мінска на выходныя — пакуль лета, за дзень можна шмат паспець. Арганізацыйная ўдача фонду — і тое, што рэстаўрацыя замка ў Любчы — адна з формаў летняй практыкі для студэнтаў архітэктурнага факультэта БНТУ, а таксама для розных іншых профільных факультэтаў ВНУ з усёй краіны.

Пакрысе да рэстаўрацыі «ўсім мірам» падключаюцца сур'ёзныя кампаніі. Іван Пячынскі распавядае: «З рыштункам для валанцёраў дапамагло Міністэрства абароны. Наваградскі лясгас дае добры лес. І вось нядаўняя радасць — беларускае прадстаўніцтва «Caparol» падаравала нам шпатлёўку на муры вежы коштам каля 3 мільёнаў рублёў. Грашыма падтрымліваюць такія кампаніі, як «Прыёр-банк», «Velcom», «Цэнтр па рэгенерацыі культурных ландшафтаў і тэрыторый». Будматэрыяламі — «Забудова» ды іншыя. Кіраўніцтва фонду не хацела б замежнай дапамогі. Адбудаваць замак, які па праве можна лічыць калыскай беларускай дзяржаўнасці, павінны самі беларусы». На ўсім, што робіцца падчас рэстаўрацыі, стаіць негалосны знак якасці: «Мы здабываем толькі якасныя матэрыялы, каб, раз збудаваўшы, доўга цешыцца добраму выніку. Каб не сыпалася».

## Хартыя–2000

Насустрач чарговай групе турыстаў, што ўсё часцей завітваюць у Любчу, Пячынскі выходзіць у антуражы адстаўнога вайскоўца на лецішчы. З кішэняў нагавіц колеру хакі тырчаць рулеткі-малаткі. Пячынскі ставіць перад сабой на траву дзіўны драўляны каркас. «Прускі мур»! — з гонарам кажа ён турыстам. Турыстам гэта яўна нічога не кажа. Так распачынаецца размова аб прынцыпах рэстаўрацыі.

Фонд «Любчанскі замак» — установа грамадская. І таму, як з любой паспалітай ініцыятывы, дзяржава пытаецца з Любчы асабліва строга. Пячынскі дзякуе Міністэрству культуры за тое, што ў 2003 годзе чыноўнікі далі веры кіраўніцтву фонду і дазволілі пачаць распрацоўку праектнай дакументацыі і выкананне рэстаўрацыйных прац «гаспадарчым чынам». Гістарычныя штудыі і археалагічныя раскопкі, па словах Пячынскага, праводзіліся тут дбайней, чым на якім-кольвек іншым аб'екце беларускай рэстаўрацыі. Мелі месца нават хімічныя аналізы. Усе навукоўцы, да іх гонару трэба сказаць, шчыравалі бясплатна — бо падрыхтоўка дакументацыі пацягнула б яшчэ на 200 мільёнаў. Хімічныя доследы далі шмат унікальнай інфармацыі пра замак. Так, напрыклад, была адкрытая наяўнасць у знешнім выглядзе замку тэхнікі зграфіта і вызначаны аўтэнтычны колер вежаў. Пасля вывазу смецця, дзядзення да ладу парка вакол замчышча і даследчай працы пачалася непасрэдна рэстаўрацыя.

Поўнай адпаведнасці аднолькавых аб'ектаў разбураным аўтэнтычным у наш час на постсавецкай прасторы не можа гарантаваць ніхто. Асноўны закон, на які абапіраюцца рэстаўратары Любчы, — Рыжская хартыя. Пагадненне, заключанае паміж краінамі Балтыі і Усходняй Еўропы ў 2000 годзе ў Рызе, дазваляе аднаўляць тыя ці іншыя гістарычныя аб'екты, абапіраючыся на дакладныя дакументальныя звесткі. У летапісах пазначана, што Любчанскі замак меў уваход у Вуглавую вежу, выкананы ў выглядзе канструкцыі «фахвэрк» — «прускі мур»: гэта калі ў драўляны каркас заліваецца мураўка, а дрэва застаецца звонку маляўнічымі «крыжыкамі», вядомымі нам па паштоўках з Германіі. І таму рэстаўратары скарыстоўваюць менавіта гэту тэхніку, працуючы па аналогіі. Усе тэхналогіі, так бы мовіць, «ідэнтычныя натуральным».

«На адзін метр канціку зграфіта пайшло 15 працоўных дзён аднаго чалавека. А вежа мае 36 метраў у перыметры», — расказвае Пячынскі. Усе, хто знаходзіцца на дзядзінцы, як па камандзе задзіраюць галовы ўверх. Дахоўка, якой накрытая вежа, дарэчы, ніякая не бляшаная, як гэта модна ў нас апошнім часам: фірма «Забудова» ахвяравала на Вуглавую вежу замка дахоўку, якая па сваіх якасцях максімальна набліжаная да дахоўкі, што калісьці пакрывала дах гэтай вежы. Каралавы колер дахоўкі выгодна адцяняе чорнабелы рэнесансны малюнак.

Што далей? Бо ўжо не застаецца сумневаў: у адзін цудоўны дзень Любчу дабудуюць. «Ёсць намер зрабіць тут музей Вялікага княства Літоўскага, ці Грунвальдскай бітвы — дзеліцца планамі Пячынскі. — Такіх музеяў у Беларусі, на жаль, няма. Магчыма, на гэтым месцы знаходзіцца драўляны Замак, які быў заснаваны самім каралём Міндоўгам. І тут быў яго двор, дзе ён прыняў хрост з 600 сваімі паплечнікамі... Крыўдна аддаваць усю гэтую багатую гісторыю суседняй Літве». Зрэшты, перад тым, як кіраўніцтва фонду «Любчанскі замак» ажыццявіць гэты свой намер, на будоўлі ў Любчы давядзецца вяртаць на месца замкавыя камяні ды «любіцца» яшчэ не адному заезду валанцёраў...

### Месца любові

Паводле легенды, на маляўнічым беразе Нёмана першы князь Вялікага княства Літоўскага Міндоўг сустрэў сваю будучую жонку Марту. І даў назву гэтаму паселішчу (адсюль і назва заснаванага ім мястэчка) — Любеч, Любча. Вядомае з XIII стагоддзя, цяпер яно — пасёлак у Гродзенскай вобласці.

У розныя часы Любча была ўладаннем баярына Андрэя Кіяна, які ратаваўся на Навагрудчыне ад татарскага нашэсця, Вялікіх князёў літоўскіх, пакуль Вітаўт не аддаў Любчу жонцы Ульяне, а потым ёй валодалі Храптовічы, Гаштольды, Кішкі, Радзівілы. Ян Кішка пасля 1547 года заснаваў у Любчы друкарню, у 1590 годзе мястэчка атрымала Магдэбургскае права.

Замак у Любчы быў збудаваны ў 1580-я гады. Займаў плошчу 85 на 85 метраў. У XVII стагоддзі меў 4 магутныя каменныя вежы, валы вышынёй ад 10 да 30 метраў, абарончы роў з трох бакоў, з поўначы быў абаронены Нёманам.

У 1655 годзе замак захапілі казакі, моцна яго пашкодзіўшы. У пачатку XIX стагоддзя замак меў ужо толькі 2 вежы. У сярэдзіне XIX стагоддзя быў збудаваны палац, які належаў роду Фельц Фейнаў (цяпер у ім — школа).

**Паводле: М. А. Ткачёв. Замки Беларуси. Мн.: Беларусь, 2002.**

ЦІКАВА

# ТАЯМНІЦА ВІЛЕНСКАЙ КАТЭДРЫ

Аляксей ХАДЫКА

**Насустрач войскам нацысцкай Германіі, якія 1 верасня 1939 года ўвайшлі на тэрыторыю Польшчы, 17 верасня, кіруючыся пактам Молатава-Рыбентропа, на землі Заходняй Беларусі і Украіны рушыла Чырвоная Армія. Беларускія тэрыторыі аб'ядноўваліся ў складзе савецкай дзяржавы, а лёс старажытнай літоўска-беларускай сталіцы Вільні, якая на некалькі дзён была адміністрацыйна ўключана ў склад савецкай Беларусі, вырашаўся на карысць далучэння да літоўскай дзяржавы.**

## Зніклы скарб

Менавіта ў гэтыя дні клір старажытнай віленскай катэдры, галоўнага каталіцкага храма ВКЛ, як і кіраўніцтва Віленскай архідыяцэзіі, у прадбачанні немінучай катастрофы, якой мусіла зрабіцца ліквідацыя царкоўнай інфраструктуры ў Заходняй Беларусі і Літве, а таксама закрыццё храма для вернікаў, вырашала апошнія бягучыя праблемы. Сярод іх і тую, якая дала матэрыял для гэтай публікацыі. Пакінуўшы Вільню, па заканчэнні вайны, у 1945 годзе, у Беластоку нешматлікія ацалелыя каноніка кафедральнай капітулы далучыліся да «Віленскай архідыяцэзіі ў Беластоку», абвясціўшы сябе сябрамі віленскай капітулы ў эміграцыі.

Частка сябраў капітулы не перажыла вайну, астатнія ўпарта маўчалі, і, здавалася, за ім былі назаўсёды пахаваныя таямніцы падзеі верасня 1939 года. У тым ліку і лёс скарбніцы катэдры, знакамітага збору найкаштоўнейшага царкоўнага начыння і ўбрання, якое збіралася пры храме цягам шасці стагоддзяў. Сотні залатых і срэбных манстранцаў і келіхаў, паціраў і даразахавальніц мастацкай работы — працы майстроў Заходняй і Цэнтральнай Еўропы і мясцовых мастакоў, шэдэўры ўсіх высокіх еўрапейскіх стыляў ад готыкі да класіцызму, падарункі ўсіх значных магнацкіх родаў ВКЛ, вялікакняскай сям'і і саноўных візіцёраў Вільні, за выключэннем нязначнай часткі прадметаў, здавалася, зніклі назаўсёды, разышоўшыся, бы дым у паветры.

## Пачатак пошуку

Аднойчы, а было гэта ў 1961 годзе, на нарадзе музейных супрацоўнікаў намеснік міністра культуры ўжо савецкай Літвы Вітаўтас Якінайціс паставіў пытанне пра тое, каб музеі больш шчыльна цікавіліся лёсам каштоўнасцяў, вядомых па архіўных апісаннях і зніклых у гістарычна нядаўні час. А прафесар Повілас Галауне, патрыярх літоўскай музейнай справы, які пачынаў сваю творчую працу са стварэння знакамітага музея Чурлёніса ў Каўнасе, прапанаваў размеркаваць паміж музеямі сферы дзейнасці, каб кожная ўстанова займалася канкрэтнымі гісторыямі знікненняў.

Так скарбніца віленскай катэдры ўвайшла ў сферу цікаўнасці Мастацкага музея Літвы, што было цалкам натуральна, улічваючы, што па вайне катэдра юрыдычна лічылася яго філіяй. І гэта рашэнне, паміж іншага, у выпадку знаходжання клада, магло дапамагчы захаваць яго ў Вільні — месцы, якому скарбы належалі гістарычна. Бо каб шукалі ўсе разам, вельмі вялікім быў шанец передачы каштоўнасцяў у піцерскі Эрмітаж або маскоўскую Аружэйную палату — паводле агульнай для СССР практыкі размеркавання найважнейшых мастацкіх каштоўнасцяў.

Але што было ў руках даследчыкаў? І з чаго яны пачалі свой пошук? Захаваліся вопісы. Першы быў зроблены ў 1552 годзе на замову біскупа Паўла Гальшанскага, але фрагментарны, з апісаннем належнасці толькі дзвюх капліц — вялікакняскай і Гаштаўта. Другі, 1598 года, складзены пад кіраўніцтвам дэкана капітулы Мікалая Дэцыя, значна больш падрабязны, з пералікам каштоўнасцяў галоўнай сакрыстыі і шасці бакавых капліц — прадметы з каштоўных металаў, царкоўны посуд, кнігі — поўная яго рэпліка захоўваецца ў Бібліятэцы віленскага універсітэта. У пашыраным у 1626 годзе спісе пералічваліся шэдэўры калекцыі гатычных, рэнесансных і раннебарочных часоў. Пазнейшыя інвентары і візітацыі катэдры, якія паказвалі развіццё і далейшае ўзбагачэнне збору, як і змяненне яго складу ў выніку ваенных падзей і шкоды ад пажараў, рэгулярна складаліся да 1830 года ўключна.

Захаваныя ў рукапісных аддзелах Віленскага універсітэта, Літоўскай акадэміі навук і гістарычнага архіва, яны давалі даследчыкам вартасны матэрыял па гісторыі збору. Праўда, пасля паўстання 1830–1831 гадоў і рэпрэсій, якія абрынуліся на каталіцкую царкву, віленская капітула дзейнічала больш абачліва, не складаючы падрабязнай дакументацыі, каб пазбегнуць канфіскацыі лёгка даступных твораў. Затое гэта паўстанне, як і падзеі 1863–1864 гадоў, паспрыялі таму, што са шматлікіх зачыненых беларускіх і літоўскіх касцёлаў да катэдры ў Вільню, пад покрывам таямніцы, звозіліся новыя і новыя шэдэўры. Укрыжаванні, дэкараваныя абкладамі і каштоўнасцямі абразы, келіхі і паціры, ампулкі для вады і віна і іншы посуд, падарункі-вотры для святынь, лампадкі, святарскае аблачэнне — прадметы дзесяткамі і сотнямі траплялі да катэдры. Прадметаў назапасілася столькі, што на мяжы XIX і XX стагоддзяў, захаваныя часткова ў Скарбніцы, былі прадстаўлены агляду не толькі вернікаў, але і іншых наведнікаў. Ад першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя захаваліся фотаздымкі шэдэўраў катэдральнага збору.



Вільня, Кафедральны сабор, фасад, сучасны выгляд



Рэлікварый св.Станіслава, канец XIV — XV стагоддзі, падножжа — пачатак XVI ст., рэстаўравана ў 1735 г. Вытворчасць — Вільня або Цэнтральная Еўропа



Вялікая манстранцыя Альберта Гаштаўта з Геранён. 1535, Вільня. Вышыня — 150 см

Аднак — насуперак наяўнай дакументацыі, насуперак намаганням шматгадовага дырэктара Мастацкага музея Рамуальдаса Будрыса, супрацоўнікі якога вялі пошук звестак пра катэдральныя скарбы ў архівах і бібліятэках Літвы, Польшчы, Расіі, Беларусі, — самога скарбу як не было.

## Замураваны скарб

Надышоў 1985 год. У катэдры праводзілася мадэрнізацыя, (з дапамогай шведскай фірмы мусіла быць пастаўленае новае кліматызацыйнае абсталяванне). Падрыхтоўчыя работы выконвалі спецыялісты музея пад кіраўніцтвам Рамуальдаса Будрыса і шматгадовага даследчыка храма археолага Напалеонаса Кіткаўскаса. Спецыялісты каўнаскага політэхнічнага інстытута вялі ультрагукавое сканаванне кладкі сабора над сутарэннямі яшчэ гатычнага часу, не кранутымі пазнейшымі перабудовамі, у якіх мусілі акуратна пралегчы новыя паветравыводныя каналы. І вось раптам, у сцяне каля капліцы Гаштаўта, размешчанай направа ад увахода ў касцёл, у калодзежы лесвічнага сходу абследаванні выявілі таямнічую закладзеную сценкай нішу.

Як сцвярджае Будрыс, ніхто з некалькіх чалавек, дапушчаных да даследавання, адразу не падумаў пра скарбніцу. Хіба — не паверылі ў нечаканы поспех. Але падрыхтаваліся да ўсялякага магчымага, і ўскрыццё прымеркавалі да даты, якую вельмі добра запомніў Кіткаўскас — 23 сакавіка, дзень нараджэння яго сына. Выходны дзень, калі ў касцёле-музеі наведвальнікаў не было. Падрыхтавалі спецыяльныя скрыні, пячаткі, усё неабходнае для таго, каб скласці вопісы магчымай знаходкі. Атрымалі дазвол міністэрства культуры: аформілі ўсё так, як мае быць, калі належнае вяртаецца свайму гаспадару.

## Зноў замуравалі

Будрыс з Кіткаўскасам, а разам з імі яшчэ толькі 2 чалавекі — археолаг Йозас Стасюлайціс і спецыяліст міністэрства Стасіс Чыпкус — адчынілі нішу. І ўбачылі тое, што чакалі, — каля 270 галоўных шэдэўраў катэдральнай скарбніцы. У святле ліхтароў пералівалася золата і срэбра, зіхацелі каштоўныя камяні. Цэлая ноч з суботы на нядзелю пайшла на тое, каб скласці падрабязны спіс каштоўнасцяў, інвентарызаваць, і, склаўшы ў скрыні, апячатаць. Наступны дзень — перавезці на службовай машыне, самастойна пагрузіўшы ўсе пакункі, у сховы галоўнага будынку музея, які месціўся тады ў віленскай ратушы. І — зноў замураваць у патаемным памяшканні. Да лепшых часоў. Не, усё афармлялася законна, як унутрымузейная працэдура — прынялі творы мастацтва на захаванне. Але да пары да часу звесткі пра знаходку не пайшлі за межы вузкага кола асоб. Колькі чалавек з мясцовага КДБ. Міністр культуры, Ёнас Білініс. Загадчык ідэалагічнага сектара ЦК Літвы Леонгінас Шэпецiс. Вітаўтас Ландсбергіс. Другога сакратара ЦК, у часы СССР — абавязковую наменклатуру Масквы, пра падзеі не паінфармавалі. Літовец у Шэпецісе перамог функцыянера.

Білініс паставіў на спісе рэзалюцыю: «Знаходкі катэдры залічыць на баланс музея як музейныя каштоўнасці».

І, як не дзіўна, інфармацыя не выйшла за вузкае кола. Зберагальнікі скарбу перажылі час, калі Гарбачоў наведваў Польшчу, спадзеючыся, што таямніца не дазволіць ставіць пытанне пра скарб як былую польскую культурную спадчыну. Перажылі і штурм віленскай тэлевежы савецкімі танкамі, распад СССР і аднаўленне літоўскай незалежнасці. І толькі пад канец 1990-х, пасля рэстаўрацыі, навуковай апрацоўкі, каталагізацыі — выйшаў з друку шыкоўны альбом «Скарбніца віленскай катэдры», а творы сустрэліся з аматарамі прыгожага. У 1998 годзе — дэманстрацыя для царкоўных і палітычных лідэраў і мас-медыя. А ў 1999 годзе — выстава «Хрысціянства ў мастацтве Літвы». Упершыню за межамі Вільні скарбніца пабывала летам 2008 года ў Каралеўскім замку ў Варшаве, восенню-зімой — на Вавеле ў Кракаве.

## Канец таямніцы

Трэба спадзявацца, што калінебудзь скарбніца пабывае і ў Беларусі, і гэта вельмі пажадана не толькі таму, што Вільня — наша агульная культурная сталіца, гістарычна шматнацыянальны горад, а скарбы катэдры збіраліся ахвярамі заможных сем'яў з усяго ВКЛ. Калекцыі твораў залатых спраў майстроў — вельмі часта інтэрнацыянальныя з паходжання, бо лепшыя шэдэўры выраблялiся ў буйных еўрапейскіх гарадах, цэнтрах ювелірнага мастацтва. На творах з катэдры — клеймы рамеснікаў Гданьска, Рыгі, Кёнігсберга, Львова, Кракава, Варшавы, Аўгсбурга, Аахена, Вены, Парыжа, Брусэля, Флярэнцыі, Рыма, Пецярбурга. Але і Віленская школа залатых спраў майстроў — ад XV да ваеннай катастрофы сярэдзіны XVII стагоддзя, войнаў са Швецыяй і Масковіяй, перажывала росквіт, сведчаннем чаму адзін са старажытнейшых твораў калекцыі — рэлікварый св. Станіслава. У XVI–XIX стагоддзях перажывалі творчы ўздым і майстэрні Коўна, Гродна, Берасця, Навагрудка, Мінска. Вялікая залатая манстранца, найлепшы шэдэўр калекцыі, твор 1535 года, выраблены ў Вільні, — колішняя ахвяра па тэстаменце канцлера ВКЛ Альберта Гаштаўта (пам. у 1539 г.) у Мікалаеўскі касцёл, збудаваны ў пачатку XVI стагоддзя ў Геранёнах. Рэлікварый св. Язафата Кунцэвіча унікальны тым, што захаваў форму саркафага святога, выкананага з суцэльнага срэбра ў XVII стагоддзі ў Гданьску і да сёння не захаванага.

Адным словам, лёс скарбніцы Віленскай катэдры дае нам некалькі прыкладаў. Па-першае, таго, як зберагаць і захоўваць, нават рызыкуючы выгадамі асабістых кар'ерных лёсаў — нацыянальныя багацці. І рупліва вяртаць іх да жыцця, праслаўляючы культурную спадчыну народа. Вяртаць, нарэшце, усё на свае месцы — бо, як кажа Будрыс, няважна, ці належыць скарбніца царкве, ці музею — яна ў Вільні. А нам варта ведаць і папулярызаваць у Беларусі гістарычную сувязь гэтай калекцыі з нашай культурай — пра што кажуць і самі творы, і архіўныя дакументы.

ПОШТА РЭДАКЦЫІ

# ШТАТНАЯ АДЗІНКА НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТОРЫКА

Віктар ХУРСІК

**Пуцявіны жыцця звялі мяне з Яўгенам Анішчанкам выпадкова. Выдатны даследчык гісторыі звярнуўся да мяне з просьбай выдаць кніжку. Я лічу патрэбным заступіцца за гісторыка і сумленнага чалавека.**

Зрэшты, тэма падзелаў Рэчы Паспалітай напрыканцы XVIII стагоддзя была цікавая і мне. Бо ў афіцыйнай гістарыяграфіі дачыненні Расіі і ВКЛ у той перыяд падаваліся няпраўдзіва. Інкарпарацыя апошняй у склад Расіі падавалася як ледзьве не паратунак для беларусаў.

Мы вельмі хутка знайшлі агульную мову. Так на свет з'явілася кніжка «Стогн» з дакументамі, якія праўдзіва асвятлялі падзеі далёкай мінуўшчыны. А потым былі новыя кнігі Анішчанкі. І ўсе яны працягвалі асвятляць абраную ім для навуковых даследаванняў тэму насільнага ўключэння беларускіх зямель у склад Расіі.

Не скажу, што тэма гэта дадавала аўтару і даследчыку асалоду грамадскага прызнання. Не раз яму ўказвалася на непажаданасць больш глыбокіх даследаванняў. Але Яўген не збочыў. На




абароне доктарскай дысертацыі ў педуніверсітэце імя Танка калегі выказалі яму шмат цёплых слоў. Апаненты таксама імкнуліся быць аб'ектыўнымі. У выніку доктарская праца атрымала адабрэнне, а дакументы на прысуджэнне ступені былі накіраваны ў Вышэйшую атэстацыйную камісію.

На жаль, тады ВАК не здолеў падняцца над існаваўшымі павевамі «вечнага» сяброўства з Расіяй і, і азіраючыся на рэзідэнцыю прэзідэнта, не зацвердзіў Яўгена Анішчанку ў доктарскім званні. Зразумела, што як і тады, так і цяпер кіраўнік дзяржавы не даваў ніякіх указанняў вучоным, як «правільна» асвятляць гісторыю стасункаў з Расіяй. Сам гісторык па адукацыі, ён бы здолеў разабрацца ў хітраспляценнях палітыкі Кацярыны II не горш, чым зараз разбіраецца ў Пуцінскіх. Але… Але, зразумела, што многія матчы ў краіне гуляюцца і без свістка прэзідэнта. Новы кіраўнік Інстытута гісторыі паказаў Анішчанку на дзверы. Спачатку Яўген знайшоў часовы прытулак у іншай арганізацыі, а зараз увогуле працуе прыбіральшчыкам.

Я трымаю ў руках чарговы 5-ы том яго выбраных твораў, якія толькі што пабачылі свет. «Абывацелі правінцыі. Інструкцыі шляхецкіх сеймікаў беларускіх земляў ВКЛ канца XVIII стагоддзя». Вялікі тоўсты фаліянт у дакументах расказвае пра тое, як малілі простыя жыхары нашага краю караля Станіслава Аўгуста абараніць ад нахабства Кацярыны, як нягледзячы ні на што спадзяваліся, што захопленыя землі будуць усё ж такі вернуты. Абывацелі давалі свае наказы паслам, якія накіроўваліся на паседжанне сейма саюзнай дзяржавы, ні ў якім разе не ўступаць ні ў які хаўрус з Расіяй. Іх прапановы падтрымлівалася дэпутатамі (пасламі), але сам кароль ужо не надта многа мог. Імкненне весці незалежную ад Расіі палітыку хутка і яго пазбавіла трона.



НАЦЫЯНАЛЬНАЯ АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
NATIONAL ACADEMY OF SCIENCES OF BELARUS

АДДЗЯЛЕННЕ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК І МАСТАЦТВАЎ
HUMANITIES AND ARTS DEPARTMENT

220072. Беларусь, г.Мінск, праспект Незалежнасці, 66, тэл. (017) 284-28-18, факс 284-07-74

24 июня 2009 г. №11-27/А-129

Анищенко Е.К.
220005
г.Минск
а/я 65

Уважаемый Евгений Константинович!

Ваше обращение в Администрацию Президента Республики Беларусь по вопросу трудоустройства было рассмотрено в Национальной академии наук Беларуси совместно с Министерством образования Республики Беларусь и Департаментом по архивам и делопроизводству Министерства юстиции Республики Беларусь, где Вы ранее работали.

В связи с выпуском молодых специалистов вакантные должности в республиканских архивных учреждениях заполнены, а вакансий научных работников для трудоустройства в государственном научном учреждении «Институт истории Национальной академии наук Беларуси» в настоящее время нет.

Академик-секретарь
Отделения гуманитарных наук и
искусств НАН Беларуси А.А.Коваленя

Узяў кніжку, паехаў парадаваць аўтара, які шчыраваў з мятлой у ранішняй ліпеньскай прахалодзе: «Яўген Канстанцінавіч, мне здаецца, гэта варта дзяржаўнай прэміі!» Усміхнуўся ў адказ, уздыхнуў, пагартаў, сказаў: «Дзякуй!» І гэтак жа спакойна дадаў: «Пачытайце дакумент № 63».

Чытаю: «Што тычыцца стану цяперашняй адукацыі ў краі, якая, магчыма, застаецца найважнейшай справай, паколькі фарміраванне сэрцаў маладых абывацеляў залежыць ад рэчаў, якія ў іх адразу будуць закладзены, паколькі ад іх зыходзіць грунтоўнае набыццё рэлігійнасці, цноты і навук, паколькі яны з'яўляюцца адзінай крыніцай для добрых абывацеляў з якой яснейшы кароль старанна папаўняе грунтоўныя асновы рэлігіі, цноты і святла ў народзе, то ваяводства даручае ягамосцям паслам прапанаваць і папрасіць станы Рэчы Паспалітай, каб адукацыйная камісія па свайму законнаму абавязку чула, старанна і ўнікліва як давала званні настаўнікам, так і экзаменавала іх, паколькі гэтай вялікай для народа справай павінны займацца самыя богабаязлівыя, вядомыя цнотай, адукаваныя ў навуковых максімах і асветленыя рэлігіяй абывацелі».

Вось яно, аказваецца, як было! Дзе ж цяпер узяць богабаязлівых? «І што, ніяк? Не спрабавалі ўладкавацца ў XXI стагоддзі па спецыяльнасці?» У адказ Яўген дастаў пісьмо: «Спрабаваў, пісаў нават у Адміністрацыю прэзідэнта. А атрымаў вось гэта, — ён падаў дакумент, — атрымаў ад таго, хто і паказаў мне некалі на дзверы. Ведаю, месцы ёсць».

Час цяпер і сапраўды складаны, не XVIII стагоддзе. Але Яўген спадзяецца. Пастаянна ходзіць у раённы аддзел па працаўладкаванню, чакае, што ўрэшце з'явіцца попыт на нацыянальнага гісторыка. Але ўжо не першы месяц — нічога. У колькіх школах ёсць месцы, але баяцца браць. А каго баяцца?

АБ'ЯВА

**КУРСЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ГІСТОРЫІ**

З новага навучальнага года зноў пачнуць дзейнічаць курсы беларускай мовы і гісторыі для вучняў 10-х класаў сярэдняй школы.

Курсы могуць наведваць усе жадаючыя.

Арганізацыйнае пасяджэнне адбудзецца **8 верасня а 17.00 на сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 13, ст.м. «Плошча перамогі»)**







Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 206 ад 20 ліпеня 2009.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
novychas@gmail.com; www.novychas.org

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 21.08.2009. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.